Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 42 (3946)
ПЯТНІЦА, 13 ЛЮТАГА
1931 г.
Цана нумару 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Рачны транспарт—на парадак дня

Рачны транспарт зьяўляецца адным з самых адсталых вучасткаў народнае гаспадаркі. Між тым, разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва, вялізарнае павялічэнне тавараных мас, якія зварочваюцца ў краіне, ставяць праблему ўдасканаленьня шляхоў зносін на здказьнейшае месца, прад'яўляюць транспарту яго чыгуначнаму, так і водному настолькі сур'ёзныя патрабаваньні, што ад выкананьня плянаў перавозак у вялізарнай ступені будзе залежыць пасьпяховае вжыцьцяўленьне ЎСІХ гаспадарчых заданьняў у бягучым годзе.

«Вугаль і транспарт — вось два кіты, якія дадуць нам магчымасьць выканаць увесь народна- гаспадарчы плян» — так вызначыў ролю транспарту т. Куйбышаў у сваім дакладзе 3-й сэсіі ЦВК Саюзу.

На рачны транспарт кладзецца ЗНАЧНАЯ ДОЛЯ адказнасьці за выкананьне пляну перавозак, прычы партыяй і ўрадам узят цьвёрды курс на няўхільную зьмену судносін грузазвароту ў бок ПЕРАДАЧЫ НА ВАДУ магчыма большай колькасьці грузаў.

Усё гэта высоўвае настойлівую необходнасьць карэнніза перапому ў рабоце рачнога транспарту, рашучага паляпшэньня ўсіх паказальнікаў яго работы, бо становішча, якое назіраецца да сучаснага моманту, ЗУСІМ не задавальняе патрабаваньні ўсё нарастаючых тэмпаў нашага разьвіцьця.

Вось чаму апублікаваная гэтымі днямі АДЗЫВА ЦК УсеКП(б) і СНК СССР АБ РАБОЦЕ РАЧНОГА ТРАНСПАРТУ набывае значэньне дакументу выключнай гаспадарча-палітычнай важнасьці, дакументу, які адкрывае новую старонку ў разьвіцьці водных шляхоў зносін.

Адзыва дае разгорнутую праграму росту воднага транспарту, адкрывае найшырэйшыя перспэктывы яго ўзмацненьня і ўздыму.

Пытаньні РЭКАНСТРУКЦЫІ, якія займаюць важнейшае месца ў агульнай сыстэме мерапрыемстваў па ўзмацненьні рачнага гаспадаркі, ставяцца адзывам ва ўсю шырыню. Гэтым наносіцца РУЙНУЮЧЫ ЎДАР ПА АПАРТУНІСТЫЧНЫХ РАЗВАЖАНЬНЯХ АБ «ПАТУХАНЬНІ» РАЧНОГА ТРАНСПАРТУ.

Прамысловасьці даецца баявое заданьне не поўнасьцю забясьпечыць выкананьне заказаў, зьвязаных з задаваленьнем патрэб рачнога транспарту.

Першачарговае значэньне набывае задача ПОЎНАЙ МАБІЛІЗАЦЫІ ЎСІХ НАЯЎНЫХ РЭСУРСАЎ РАЧНОЙ ГАСПАДАРКІ, рашучая барацьба за павялічэньне норм пагрузкі, за скарачэньне прастояў, за павышэньне вымяральнікаў, за механізацыю пагрузачных работ.

Адзыва ЦК і СНК уносіць поўную выразнасьць у АРГАНІЗАЦЫЙНУЮ СТРУКТУРУ АПАРАТУ рачнога транспарту, што адыгрывае важную ролю ў справе ажыцьцяўленьня транспартам сваіх задач.

ЦК АДЗНАЧЫЎ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧАЕ СТАНОВІШЧА РАБОТЫ ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ВОДНІКАЎ, слабае разгортваньне ўдарніцтва, нізкі стан працоўнай дысцыпліны. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі водникаў павінны неадкладна дабіцца рашучых зрухаў у бок ажыцьцяўленьня лёзунгу «тавам да вытворчасьці», стаць сапраўднымі змагарамі за выкананьне прамфінпляну.

Вось тыя асноўныя задачы, якія высунуты адозвай ЦК і СНК.

РАЧНЫ ТРАНСПАРТ ВА ЎМОВАХ БССР АДЫГРЫВАЕ ВЕЛЬМІ ВАЖНУЮ РОЛЮ. Наяўнасьць водных шляхоў ставіць у парадак дня задачу максымальнага пашырэньня матар'яльнай базы рачной гаспадаркі, найбольш поўнага выкарыстаньня рачнога транспарту для перамяшчэньня тавараных мас. Адозва ЦК і СНК высоўвае перад рабочай класай БССР цэлы рад сур'ёзных задач, за выкананьне якіх трэба ўзяцца, засучыўшы рукавы.

Рачны транспарт БССР РАСЬЦЕ з году ў год. Перавозкі пасажыраў і грузаў у параўнаньні з 1927 годам павялічыліся ў тры разы. Грузаперавозкі ў 1930 годзе дасягнулі 100 тысяч тон супроць 30 тысяч тон у 1927 годзе. Праведзен рад работ па паляпшэньні судаходных шляхоў (дзвачышчэньне, дна-паглыбленьне, выпраўленьне рэчышча, аднаўленьне гідра-тэхнічных пабудоў і інш.). Капіталаўкладаньні на паляпшэньне водных шляхоў вызначаны на 1931 год у разьмерэ 5 млн. руб. Прыступлена да пабудовы значнай колькасьці непаравога флёту. Выкачаецца вялікая работа па поўнай рэканструкцыі Дняпра, якая выклікаецца скачэньнем работ па Дняпрабудзе, што адкрывае просты шлях у Чорнае мора.

Але, натуральна, тэмпы разьвіцьця рачнога транспарту да сёнешняга дня ні ў якім разе НЯ МОГУЦЬ ПАРТЫЮ ЗАДАВОЛІЦЬ І агульнае для рачнога транспарту палажэньне — як найбольш адсталага вучастку народнае гаспадаркі — застаецца для БССР ва ўсёй сіле. З усёй сілай трэба падкрэсьліць, што НЕДАХОПЫ РАБОТЫ, якія ёсьць у сыстэме рачнога транспарту, указаныя ў адозьве ЦК і СНК, адносяцца ў сваёй большай частцы да БЕЛАРУСКІХ арганізацый.

Партыйная нарада пры ЦК КП(б)Б па рабоце рачнога транспарту, якая сёньня адкрываецца, павінна зьвязіца важнейшым момантам у справе перавозу рачнога транспарту на сапраўды баявыя рэвалюцыйныя тэмпы работы ў справе вырашэньня практычных задач, указаных у адозьве ЦК УсеКП(б) і СНК СССР і зьвязаных з надыходзячай навігацыяй.

Павышэньне патрабаваньня да рачнога транспарту дыктуе неабходнасьць распрацоўкі ўсёй сумы пытаньняў па разьвіцьці водных шляхоў зносін, увязкі іх у ВЫРАЗНЫ АДЗІНЫ ПЛЯН, які ўпічваў-бы патрабаваньні і асаблівасьці народнае гаспадаркі БССР. Усяка роду саматужніцтву, ведамственым пунктам погляду павінен быць паложан рашучы канец. БССР павінна мець генэральны плян рэканструкцыі і разьвіцьця рачнога транспарту.

РАМОНТ паравога і непаравога флёту знаходзіцца Ў ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМ СТАНЕ і можа пераварыцца ў сур'ёзны тормаз у бягучай навігацыі. Пытаньні суднарамонту, суднабудаўніцтва павінны стаць у цэнтры ўвагі партыйных і гаспадарчых арганізацый. Беларускі рачны транспарт павінен сустрэць чарговую навігацыю ва ўсеўзброеньні.

Асаблівая ўвага павінна быць сканцэнтравана на пытаньнях ПАРТЫЙНАЙ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНАЙ РАБОТЫ, перабудовы яе ў бок найбольш поўнага забясьпячэньня выкананьня вытворчых задач, перанясеньня цэнтру ўвагі ў нізавыя зьвяны. Першымі крокамі ў гэтых адносінах павінна зьвяціца АРГАНІЗАЦЫЯ СУДОВЫХ ПРЫСТАННЫХ ЯЧЭЕК І ПРАФКАМІТЭТАЎ. Партыйныя камітэты павінны ў бліжэйшы-ж час забясьпечыць рашучы зрух у галіне ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны на рачным транспарце, узьнясьця прадукцыйнасьці працы, разгортаньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Партыйная нарада па рачным транспарце, на аснове адозвы ЦК і СНК, вызначыць прыстасоўна да мясцовых умоў, практычныя шляхі ўздыму рачнога транспарту на вышэйшую ступень, упарадкаваньня наяўнай транспартнай гаспадаркі, удакладненьня арганізацыйных форм кіраўніцтва, падрыхтоўкі КАДРАЎ, паляпшэньня арганізацыі ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ (стварэньне арганізацый водна-транспартнай каапэрацыі) і г. д.

Рачны транспарт уступае ў новую фазу свайго разьвіцьця. Удзельная вага яго непараўнальна ўзрастае. У адпаведнасьці з гэтым партыйныя арганізацыі павінны павярнуцца тварам да рачнога транспарту, забясьпечыць яго штодзённым кіраўніцтвам і дапамогаю. Транспарт — базы вучастак работы і сюды трэба накіраваць максымум нашай увагі, нашай энэргіі і сіл.

Намаганьнямі партыі, рабочае клясы і ўсіх яе арганізацый мы дабіемся поўнага выкананьня адозвы ЦК і СНК, дамо рашучы адпор апартуністычнай нелавацэнцы рачнога транспарту, выведзем яго на шлях хуткага і рашучага ўздыму, забясьпечым ажыцьцяўленьне плянаў трэцяга году пяцігодкі.

Рачны трэцяга году пяцігодкі. Рачны транспарт — на парадак дня.

„Пілсудзкі ўсімі сіламі падрых тоўвае вайну супроць СССР“

„АГОНЬ, ЯКІ РАСПАЛЬВАЕЦЦА ІМПЭРЫЯЛІСТАМІ, УКАНЦЫ КАНЦОЎ СПАЛІЦЬ ІХ САМІХ“

Пераможа Савецкі Саюз, Савецкая Эўропа“

З прамовы камдэпутата т. Штэкера ў рэйхстагу

БЭРЛІН, 11. На сёнешнім пасяджэньні рэйхстагу выступіў па пытаньнях замежнай палітыкі Нямеччыны камдэпутат тав. Штэкер.

Палемізуючы з нацыянал - сацыялістамі (фашыстамі), тав. Штэкер заявіў, што мэта і тактыка цяперашняй нямецкай замежнай палітыкі сьведчыць аб адзіным фронце нац.-сацыялістаў. Дэманстрацыйны выхад нац.-сацыялістаў з рэйхстагу паказвае, што яны баяцца на вачох у мас прадэманстраваць трусьліву палітыку ў адносінах да пляну Юнга, занятую імі ў камісіі па замежных справах рэйхстагу. Штэкер нагадвае, што 28-га кастрычніка ў гэтай камісіі нацыянал-сацыялісты адхілілі прапанову камуністаў аб выхадзе Нямеччыны з Лігі Нацый і неадкладным сыненьні пляцжоў па пляне Юнга. Тав. Штэкер зачытвае заяву Гітлера, з якой відаць, што нацыянал-сацыялісты згодны выканаць усе абавязацельствы, узятыя на сябе Нямеччынай у адносінах замежных пазык.

Далей выкрываецца сутнасьць славутага нямецка-французкага зьбліжэньня і мэты паездкі Пілсудзкага ў Парыж. Тав. Штэкер прыводзіць водгукі буржуазнага друку, які адкрыта гаворыць, што Пілсудзкі ўсімі сіламі падрыхтоўвае вайну супроць Савецкага Саюзу і стараецца забясьпечыць сабе «нэйтралітэт» Нямеччыны. Пілсудзкі імкнецца да таго, каб Нямеччына забясьпечвала Польшчу зброяй для вайны супроць Савецкага Саюзу. «Аднак, — заўляе т. Штэкер, — агонь, які зараз разпальваецца імпэрыялістамі, нарэшце, спаліць іх самих».

У заключэньне тав. Штэкер, пад бурныя аплёдысмэнты камуністаў, заяўляе: «Дэмагогія нацыянал-сацыялістаў разьлятецца ў пух і прах. Посьпех нац.-сацыялістаў быў толькі часовым зьявішчам. Пераможа Савецкі Саюз, які ўжо зараз будуе сацыялізм, пераможа Савецкая Эўропа, Савецкі сьвет, бо на прыкладзе Савецкага Саюзу ўжо цяпер ясна, што сацыялістычная плянавая гаспадарка пераможа капіталістычную анархію». (ТАСС)

Замест „працы і хлеба“ беспрацоўным—кулі дум-дум

Адзіны выхад з галечы і голаду—пралетарская рэвалюцыя

З прамовы тав. Готвальда

ПРАГА. У чэха-славацкім парляманце ад імя камфракцыі выступіў тав. Готвальд з вялікай прамовай з повада расстрэлу рабочых і беспрацоўных у Дуксе (Паўночна-Заходняя Чэхія).

Што-ж у сапраўднасьці адбылося ў Дуксе? Там, як і ва ўсіх буйных гарадох Паўночна-Заходняй Чэхіі, шматлікія натоўпы беспрацоўных выйшлі на вуліцы дэманстраваць за ўвядзеньне ўсеагульнага дзяржаўнага страхаваньня беспрацоўных за кошт дзяржавы і катрыманых рабочымі, сьцьвярджае, што жандары страляні ў дэманстрантаў разрыўнымі кулямі дум-дум. «Удржаль (прэм'ер) абвінавачвае нас, камуністаў, у тым, што мы злоўжываем парляманцкім імунітэтам, — гаворыць далей тав. Готвальд. — Так, вы маеце рацыю. Камуністычныя дэпутаты і кожны камуніст ідуць на чале рабочых мас і беспрацоўных, кіруюць іх барацьбой і падстаўляюць свае грудзі пад вашы шашкі.

У Альтоне і Ньюмюнстэры (Нямеччына) тры рабочыя былі цяжка паранены фашыстамі, якія напалі на рабочы сход. На здымку: Зьлева направа Гаман, Прын і Бэдэкер, параненыя фашыстамі.



Для «хутчэйшага вырашэньня» праблемы разбраеньня ў ПАЗШ уводзіцца танк, які разьвівае скорасьць у 120 км. за гадзіну. На здымку самая новая модэль амэрыканскага танка.

Расійскія „эканамісты“ цьвёрдалобых выдалі сябе з галавой

БЯЗГЛУЗЬДЗІЦА ПАКАЗАНЬНЯЎ „СЬВЕДАК“ АБ ПРЫМУСОВАЙ ПРАЦЫ У СССР

ЛЁНДАН, 11. У лібэральнай «Манчэстэр Гардыян» зьмешчаны ліст доктара Фэргюсона, які высьмейвае паказаньні «сьведак» аб ужываньні так званай «прымусовай працы» ў СССР. Фэргюсон заначае, што паказаньні сфабрыкаваны людзьмі, якія ня маюць представленьня аб лесараспрацоўках наогул. У паказаньнях «сьведак» паведамляецца, што лесараспрацоўкі праводзяцца на мясцох, дзе зямля заставецца замерзлай круглы год. Фэргюсон указвае, што ў такой паласе ня могуць правадзіцца лесараспрацоўкі, бо на прамарожанай глебе ня могуць расьці дрэвы.

Сьмехатворнымі зьяўляюцца таксама цьверджаньні, што работы ў гэтай паласе праводзяцца з 5 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара, бо гэта азначала-б працаваць, па меншай меры, 8 гадзін у поўнай цемры.

Далей у паказаньнях паведамляецца, што норма выпрацоўкі на лесараспрацоўках у СССР — 35 дрэў у дзень на чалавека. Гэта цьверджаньне Фэргюсон лічыць «фантастычным». 35 дрэў займаюць 1 акр плошчы. Цяжка сабе ўявіць, — піша Фэргюсон, — магчымасьць зваліць зімой 35 дрэў, ды яшчэ на тэрыторыі, пакрытай, як апісваюць «відавочцы», на 6 футаў сьнегам.

АРЫШТ Б. ТАРАШКЕВІЧА—НОВАЯ ПРАВАКАЦЫЯ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

Супольны фронт нямецкай і польскай ахранкі

Віленская буржуазная прэса ад 11 лютага падае падрабязнасьці арышту былога дэпутата польскага сойму, аднаго з праваднёроў 100-тысячнай беларускай Работніцка-Сялянскай Грамады, разгорнелай польскімі фашыстамі ў 1927 годзе — Б. ТАРАШКЕВІЧА.

Фашысцкі «Кур'ер Віленскі» піша, што «Тарашкевіч пасьля таго, як ён уцёк з Польшчы, пасяліўся ў Гданску, дзе, нібы, падтрымліваў цесную сувязь з Масквою і Менскам».

«Дайшло да ведама польскай упады, — піша далей газэта, — што Тарашкевіч у хуткім часе мае выехаць у Маскву, і за ім устаноўлен быў пільны нагляд. І сапраўды, — піша газэта, — у пятніцу, 6 лютага, мінулага тыдню Тарашкевіч выехаў у Гданск у экстэрытарыяльным вагоне нямецкага цягніка ў Рыгу праз кардор. На СТ. ЖЧАЎ у вагон увайшоў камісар польскай паліцыі і патрабаваў ад Тарашкевіча асабістых дакумантаў, пасьля чаго высадзіў яго з вагона і арыштаваў».

Як падае далей гэты фашысцкі сьпісток, пры вобыску ў Тарашкевіча знойдзена шмат кампрамэтуючых дакумантаў, якія, нібы, сьведчаць аб тым, што «Тарашкевіч выклікан у Маскву з мэтай арганізацыі ў Зах. Беларусі дывэрсыйных атрадаў».

Пад узмоцненай вартай Тарашкевіч прывезены ў Варшаву і пасаджан у адну з мясцовых турам. Пачалося сьледзтва.

Другая фашысцкая бульварная газэта «Кур'ер Пораны» са злорадствам піша пра арышт Тарашкевіча і чакае, што ў сувязі з гэтым арыштам пачнецца новая хваля масавых вобыскаў і арыштаў.

***

Арышт Тарашкевіча ў нямецкім экстэрытарыяльным вагоне зьяўляецца НОВАЙ ПРАВАКАЦЫЯЙ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ ПРЫ ДЗЕЙНЫМ ПАДТРЫМАНЬНІ І СА ЗГОДЫ НЯМЕЦКАЙ АХРАНКІ. Нямецкая ўлада Гданску, якая з пенаю ў роце абараняла свой суверэнітэт у выглядзе недапушчэньня польскіх надпісаў на паштовых скрынках, — на гэты раз маўчыць, як вады ў рот набраўшы, маўчыць, КАЛІ СПРАВА ДАТЫЧЫЦЬ АРЫШТУ РЭВАЛЮЦЫЯНЭРА ў экстэрытарыяльным вагоне яе цягніка, КАЛІ САПРАЎДЫ ПА РУШАН ЯЕ СУВЭРЭНІТЭТ. Паводле БУРЖУАЗНАГА ПРАВА, польскі камісар ня меў права ня толькі правяраць дакументы ў вагоне, але нават ня меў права зайсьці ў гэты вагон.

Арышт Тарашкевіча лішні раз паказвае і пацьвярджае, ЧЫМ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА БУРЖУАЗНАЕ ПРАВА І РОЗНЫЯ МІЖНАРОДНЫЯ ДАГАВАРЫ, падпісаныя імпэрыялістамі. Арышт Тарашкевіча зьяўляецца паказальным і тым, што імпэрыялісты, ня гледзячы на трызьню паміж сабою, ня гледзячы на зялізарныя супярэчнасьці паміж паасобнымі імпэрыялістычнымі групоўкамі,— калі справа датычыцца барацьбы з рэвалюцыйным рухам, дык у гэтым пытаньні ЯНЫ САЛІДАРНЫ і выступаюць супольным фронтам.

Страшэнны фашысцкі тэрор у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, БАРБАРСКІЯ КАТАВАНЬНІ КРЫВАВЫМІ ДЭФЭНЗЫЎНЫМІ АГЕНТАМІ-САДЫСТАМІ ПАЛІТЭЗЬНЯВОЛЕНЫХ У ЛУЦКІХ ЗАСЬЦЕНКАХ, АРЫШТ УСЯГО ЗЬЕЗДУ ППС-ЛЯВІЦЫ Ў ЛОДЗІ І РАЗГРОМ ГЭТАЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ НА ПРАВІНЦЫІ, НАРЭШЦЕ, ПРАВАКАЦЫЙНЫ АРЫШТ Б. ТАРАШКЕВІЧА, — УСЁ ГЭТА СЬВЕДЧЫЦЬ АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ПРЫСЬПЕШАНЫМІ тэмпамі польскім фашызмам тылоў для будучай вайны з СССР. Працоўныя масы ўсяго сьвету павінны ўзьняць свой рашучы голас пратэсту супроць крывавай расправы польскага фашызму над авангардам пралетарыяту і працоўкага сялянства Польшчы.

ДЛЯ „РАБОЧАГА“ УРАДУ КІШЭНІ БУРЖУАЗІІ ДАРАГЭЙШЫЯ, ЧЫМ ПАГІБЕЛЬ СОЦЕНЬ ТЫСЯЧ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ЛЁНДАН, 11. Спрэчкі ў палаце абшчын па ўнесенай кансэрватарамі рэзалюцыі аб недавер'і, а ўраду прайшлі пад знакам наступленьня ўсіх трох партый буржуазіі за жыцьцёвы ўзровень рабочых. Былы вайсковы міністар ва ўрадзе Балдуіна Ворцінгтон Эванс, які ўнёс ад імя кансэрватараў рэзалюцыю аб недавер'і, абураўся тым, што выдаткі на дапамогу беспрацоўным складаюць 45 млн. фунтаў стэрлінгаў, вамест прадугледжаных 12,5, а таксама ростам падаткаў, сумы якіх павялічыліся на 50 млн. фунтаў стэрлінгаў. Эванс скардзіўся, што крэдыт Англіі падрываецца, што вывад золата з Лёндану ня спыняецца. Паводле яго слоў, урад вядзе краіну да фінансавай катастрофы.

Выдатны па сваім антырабочым характары быў адказ міністра фінансаў Сноўдэна (члена рабочай партыі), які заявіў, што выдатканьне сродкаў на аказаньне дапамогі беспрацоўным, як гэта мае месца цяпер, далей немагчыма. Пытаньне павінна быць вырашана шляхам згоды паміж усімі партыямі. З другога боку, Сноўдэн лічыць немагчымым павялічэньне расходаў пры цяперашнім стане прамыловасьці, бо гэта было-б кроплай, якая пераполніць чашу цярпеньня. Становішча бюджэту, паводле слоў Сноўдэна, вельмі сур'ёзнае. Чакаецца да канца году буйны дэфіцыт. Расходы ўзрасьлі. Даходы зьменшыліся. Сноўдэн лічыць, што асноўнымі прычынамі цяжкага становішча, якое зараз стварылася, зьяўляецца рост беспрацоўя, з аднаго боку, і вялікі цяжар ваенных даўгоў — з другога. Выхад з крызісу Сноўдэн бачыць толькі ў зьніжэньні заработнай платы. «Намаганьні перамагчы крызіс, — гаворыць Сноўдэн, — пацягнуць за сабой часовыя ахвяры з боку ўсіх».

Прамова Сноўдэна, у якой ён так адкрыта выказаўся за зьніжэньне дапамогі беспрацоўным і скарачэньне заработнай платы, зрабіла вялікае ўражэньне ў палаце. Старшыня левага крыла лейбарыстаў Вільям Броўн заявіў, што прамова Сноўдэна тусім разьбівае надзеі рабочых, з нараньнем вырывае ўсю філёзофскую аснову, на якой пабудаваны рабочы рух. Павінен быць народжаны новы рух, на чале якога-б сталі новыя людзі, якія адкінуць філёзофію старых партый і заклічуць не да слоў, а да дзеяньняў.

Рэзалюцыя кансэрватараў адхілена 310 галасамі супроць 35. Папраўка лібэралаў прынята 168 галасамі супроць 21 голасу дэпутатаў левага крыла лейбарыстаў.

45 капеек—беспрацоўнаму, мільярды—на узбраеньні

ПАРЫЖ, 8. У францускім парляманце выступіў упяршыню пасьля свайго вызваленьня з турмы камуністычны дэпутат Андрэ Марці. Тав. Марці патрабаваў тэрміновага абгаварэньня пытаньня аб беспрацоўі.

— Ці доўга яшчэ, — заявіў Марці, —будзе працягвацца гэта скандальнае становішча, пры якім беспрацоўным выдаюць дапамогу ў 6,5 франк. (каля 45 кап.) у дзень, у той час як на падрыхтоўку да вайны выдаткоўваецца 20 мільярдаў, на паліцыю — 2 мільярды, і ў той самы час, як у кладоўнях францускага банку сабрана золата на 54 мільярды».

У заключэньне тав. Марці заявіў:

«Амаль усюды рабочая кляса пачынае прачынацца сваё абурэньне і сваю нецярпімасьць. Мы заяўляем, што пры ўсякім зручным выпадку, мы станем на чале рабочай клясы для таго, каб павесьці яе ў непасрэднае наступленьне супроць вашага злачыннага ладу».

Парлямант 273 супроць 249 галасоў пастанавіў абмеркаваньне пытаньня аб беспрацоўі адкласьці.

Разгром рэвалюцыйных прафсаюзаў у фашысцкай Фінляндыі

ГЕЛЬСІНГФОРС. У Гельсінгфорскім судзе пачаўся працэс левых прафсаюзаў. Да суда прыцягнуты цэнтральнае аб'яднаньне фінляндзкіх прафсаюзаў, з таксама 1.200 мясцовых прафарганізацый. Абвінавачэньне патрабуе канчатковага закрыцьця ўсіх левых прафарганізацый, якія ўвосень былі часова закрыты міністрам унутраных спраў да пастановы суда.

НАЙВЯЛІКШАЯ Ў СЬВЕЦЕ ТЭЛЕФОННАЯ ЛІНІЯ ЎЛАДЫВАСТОК-МАСКВА

Праводка першага зьвяна Хабараўск-Чыта

ХАБАРАЎСК, 8. Пачата праводка ўздоўж Амурскай чыгункі тэлефоннай лініі Хабараўск — Чыта. Гэта лінія будзе адным са зьвеньняў найвялікшай у сьвеце тэлефоннай лініі — Масква—Уладывастак.

Даўжыня лініі Чыта—Хабараўск, уключаючы адгалінаваньні—Благавешчанск—Бачкарова і Срэтенск — Куэнга, дасягае 2.415 кілёмэтраў. Праводку лініі мяркуецца скончыць у лістападзе 1931 году.

Значэньне новай тэлефоннай лініі для эканамічнага і культурнага разьвіцьця краіны вялізарнае. Праводка ідзе вельмі інтэнсіўна, ня гледзячы на вялікія труднасьці — пустынную мясцовасьць, балоты і горы.

Новыя назначэньні

МАСКВА, 11. Савет Народных Камісараў Саюзу ССР пастанавіў назначыць тав. Кржыжаноўскага Глеба Максімавіча, членам прэзыдыуму Вышэйшага Савету Народнае Гаспадарці Саюзу ССР.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР пастанавіў задаволіць просьбу тав. Кржыжаноўскага Г. М. аб ослабаненьні яго ад абавязкаў намесьніка старшыні Дзяржаўнай Плянавай Камісіі Саюзу ССР, з прычыны пераходу яго на іншую работу.

Прэзыдыум ВСНГ СССР пастанавіў ослабаніць т. Кубіка ад абавязкаў начальніка Энэргацэнтру ВСНГ, з прычыны пераходу яго на іншую работу.

Начальнікам Энэргацэнтру ВСНГ зацверджаны т. Кржыжаноўскі.

Узмацніць кіраўніцтва перавыбарамі ў калгасах

Тэлеграма ЦК КП(б)Б усім райкомам КП(б)Б

Ход перавыбараў у калгасах сьведчыць аб нізкай яўцы калгасьнікаў на перавыбарчыя сходы, аб нізкім процанце жанчын і калгасьнікаў у праўленьнях калгасаў.

ЦК абавязвае ўзмацніць кіраўніцтва перавыбарамі, абавязкова выканаўшы дырэктывы ЦК аб поўнай яўцы на перавыбарчыя сходы і ўцягненьні жанчын у праўленьні калгасаў.

ШАРАНГОВІЧ.

Да адкрыцьця нарады па арганізацыі працы ў калгасах

Арганізацыю працы ў калгасах—на вышэйшую ступень

Адным з найбольш вузкіх месц у калгасным будаўніцтве да гэтага часу зьяўляецца арганізацыя працы.

Пастановы XVI зьезду УсеКП(б) і рад іншых дырэктыў партыі па гэтым пытаньні яшчэ не знайшлі практычнага прапампеньня ў штодзённай рабоце мясцовых партарганізацый і калгаснаакаапэрацыйнай сыстэмы. Між тым, ІМЕННА ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСАХ — ПАВЫШЭНЬНЕ ЯКАСЬЦІ РАБОТЫ, УСТАНАЎЛЕНЬНЕ ВЫРАЗНАГА ЎНУТРЫКАЛГАСНАГА РАСПАРАДКУ, ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА, ПОЎНАЕ І РАЦЫЯНАЛЬНАЕ СКАРЫСТАНЬНЕ НАЯЎНАЙ У КАЛГАСАХ РАБОЧАЙ СІЛЫ, ШЫРОКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА—ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ВАЖНЕЙШАЙ ЗАДАЧАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЙ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ. АД ПРАВІЛЬНАГА І НЕАДКЛАДНАГА ЯЕ ВЫРАШЭНЬНЯ Ў ЗНАЧНАЙ СТУПЕНІ ЗАЛЕЖЫЦЬ ВЫКАНАЧЬНЕ ЗАДАНЬНЯЎ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ І ДАЛЕЙШЫ РОСТ КАЛГАСНАГА РУХУ.

Вынікі першага гаспадарчага году, разьмеркаваньне ўраджаю і даходаў у калгасах наглядна паказваюць значныя перавагі калектыўнай працы перад дробнымі аднаасобнымі гаспадаркамі: перавагі, якія могуць быць значна большымі, калі правільна арганізаваць працу ў калгасах.

У РАДЗЕ ЛЕПШЫХ КАЛГАСАЎ БССР МЫ І НА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ МАЕМ ЎЖО ДАВОЛІ ДОБРЫЯ ПРЫКЛАДЫ ВЫСОКАЙ ПРАДУКЦЫЯНАСЬЦІ ПРАЦЫ, БОЛЬШАЯ ЭФЭКТЫЎНАСЬЦІ КАЛГАСНАЙ ПРАЦЫ ПЕРАД АДНААСОБНАЙ ГАСПАДАРКАЙ. Нядаўна праведзенае БАН абсьледаваньне некаторых калгасаў, вывучэньне баляансаў работы гэтых калгасаў выявіці наступнае: у той час, КАЛІ ПА КАЛГАСАХ ЗАТРАТА ПРАЦЫ НА 1 ГЭКТАР ЖЫТА СКЛАДАЕ 21,9 ПРАЦАДЗЁН, У ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ—37,8 ДЗЁННА 1 ГЭКТ. АЎСА Ў КАЛГАСАХ—19,9 ПРАЦАДЗЁН, У ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ — 33,8 ПА БУЛЬБЕ—59,4 І 76,0; ПА ЯЧМЕНІ — 21,6 І 40,8; І ТОЛЬКІ ПА ГАРОДНІХ КУЛЬТУРАХ КАЛГАСЫ АДСТАЮЦЬ АД АДНААСОБНІКАЎ: У КАЛГАСАХ НА 1 ГЭКТ. АГАРОДУ ЗАТРАЧАНА 181,2 ПРАЦАДЗЁН У ТОЙ ЧАС, ЯК У АДНААСОБНІКАЎ ТОЛЬКІ 117,5.

Гэтыя дасягненьні зьяўляюцца вынікам, з аднаго боку, ужываньня больш высокай тэхнікі апрацоўкі, а з другога—шырокага разгортваньня ў калгасах сацспаборніцтва і ўдарніцтва. ПАВОДЛЕ ДАНЫХ КАЛГАСЦЭНТРУ, АМАЛЬ ШТО 30 ПРОЦ. КАЛГАСАЎ АХОПЛЕНА САЦСПАБОРНІЦТВАМ І ЎДАРНІЦТВАМ. КАЛГАСЫ БЫЛУЧЫЛІ У ЯКАСЬЦІ СВАЙГО ПЕРАДАВОГА АТРАДУ ЗВЫШ 10.000 УДАРНІКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ, ПАКАЗАЎШЫХ НА ПРАКТЫЦЫ МАСАВЫЯ ПРЫКЛАДЫ ВЫСОКАЙ ПРАДУКЦЫЯНАСЬЦІ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ПРАЦЫ.

І ўсё-ж, ня гледзячы на гэтыя дасягненьні, трэба прызнаць, што арганізацыя працы ў абсалютнай большасьці калектыўных гаспадарак знаходзіцца на вельмі нізкай ступені разьвіцьця. Адсутнасьць выразнага вытрыманага кіраўніцтва з боку райкалгасаюзаў, праўленьняў самих калгасаў, адсутнасьць належнага вучоту працы калгасьнікаў ПА КОЛЬКАСЬЦІ І ЯКАСЬЦІ, неналаджанасьць кантролю за выкананьнем нарадаў, якія даюцца калгасьнікам, надзвычай нізкі процант скарыстаньня наяўнага запасу рабочых рук—усе гэтыя ненармальныя зьявішчы скарыстоўваюцца кулацкімі элемэнтамі вёскі і іх агентамі ў радох партыі для штодзённай барацьбы супроць калгасаў, якія яшчэ не замацаваліся. Трэба з усёй рашучасьцю прызнаць, што рад прарываў у выкананьні калгасамі сваіх гаспадарчых заданьняў і с.-г. работ у мінулым годзе зьяўляюцца ня вынікам недахвату рабсілы ў гэтых гаспадарках, аб чым на кожным кроку гаворыць правыя апартуністы, а вынікам няўмелай пастаноўкі арганізацыі працы, няправільнай расстаноўкі рабсілы, бязьдзейнасьці і скажэньняў у справе правільнага разьмеркаваньня ўраджаю і прыбыткаў паміж калгасьнікамі, вынікам значных нявыхадаў на работу, прастояў машын і г. д.

Вывучэньне баляансаў працы ў некаторых калгасах паказвае, што нават у больш старых калгасных гаспадарках НАЯЎНАЯ МУЖЧЫНСКАЯ РАБОЧАЯ СІЛА ВЫКАРЫСТОЎВАЛАСЯ НА ПРАЦЯГУ ГОДУ НЯ БОЛЬШ ЧЫМ НА 50-60 ПРОЦ., А ЖАНОЧАЯ СІЛА ЗНАЧНА МЕНШ ТАГО — 20-35 ПРОЦАНТАЎ. ГЭТЫЯ ФАКТЫ Б'ЮЦЬ ПРОСТА Ў ЛОБ ПРАВЫМ ЭЛЕМЭНТАМ, ЯКІЯ РАЗВАЖАЮЦЬ СЁНЬНЯ АБ НЕАБХОДНАСЬЦІ СКАРАЧЭНЬНЯ ГАСЕЎНЫХ ПЛОШЧАЎ ПАД ТЭХНІЧНЫЯ І ПРАПАШНЫЯ КУЛЬТУРЫ, З ГРЫЧЫНЫ, НІБЫТА, ВЯЛІКАГА НЕДАХВАТУ РАБОЧЫХ РУК У КАЛГАСАХ. У ГЭТЫМ ГОДЗЕ МЫ ПАВІННЫ БОЛЬШ ПРАВІЛЬНА СКАРЫСТАЦЬ ПРАЦУ ТАК, КАБ НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАЦЬ ДАНЫЯ ПА КАЛГАСНЫМ СЭКТАРЫ ЗАДАНЬНІ, АЛЕ І ВЫЛУЧЫЦЬ РАБОЧЫЯ РУКІ ДЛЯ ПАТРЭБ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ

КАМПАРТЫЯ ЗАХ. БЕЛАРУСІ

„цалкам падтрымлівае правільную ленінскую лінію ЦК КП(б)Б у нацыянальнай палітыцы, непрымірымую барацьбу супроць нацыяналістычных ухілаў“

КПЗБ СУПРОЦЬ НАЦДЭМАЎ І НАЦФАШЫСТАЎ

Сёньня мы публікуем рэзалюцыю Цэнтральнага Камітэту нашай брацкай кампартыі Заходняй Беларусі аб выкрыцьці контр - рэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай групы ў БССР і барацьбе з нацыянал - апартунізмам. Гэта рэзалюцыя мае бязумоўна ВЯЛІКАЕ ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ. Яна дэманструе поўную салідарнасьць КПЗБ і яе Цэнтральнага Камітэту з тэй палітыкай, якую праводзіць ЦК КП(б)Б. Яна ясна і выразна падкрэсьлівае поўную згоду ЦК КПЗБ з нацыянальнай палітыкай ЦК КП(б)Б і яго барацьбой супроць нацыянал-дэмакратычнай контр-рэвалюцыі, супроць нацыянал - апартуністычнай агентуры ўнутры партыі.

Нельга не падкрэсьліць асаблівую важнасьць гэтага дакументу ў цяперашні пэрыяд, калі ў нас у БССР у абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы разгортваецца сацыялістычнае наступленьне, а ў Зах. Беларусі і Польшчы абдываецца рэвалюцыйны ўздым шырокіх працоўных мас, і польскі фашызм шукае выхаду з свайго крызіснага становішча ў падрыхтоўцы да вайны супроць Савецкага Саюзу.

Рэзалюцыя ЦК КПЗБ, аналізуючы сутнасьць беларускага нацыянал - дэмакратызму, сутнасьць яго агентуры ўнутры КП(б)Б—нацыянал-апартунізму—бярэ гэта пытаньне ва ўсёй яго паўнаце. Рэзалюцыя зусім правільна паказвае на пераможнае наступленьне сацыялізму, на вялікія посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва, якія выклікаюць шалёнае супраціўленьне адміраючых клясаў, а ў канкрэтных умовах БССР супраціўленьне беларускага купацтва і выяўнікоў яго клясавых інтарэсаў — беларускіх нацыянал-дэмакратаў. Толькі праваапартуністычныя агенты кулака ў сваіх «тэарэтычных разважаньнях» могуць адмаўляць абвастрэньне клясавай барацьбы, ня бачыць росту актыўнасьці ўсіх буржуазна-кулацкіх элемэнтаў у нашай краіне і на практыцы быць праваднікамі шкодніцкіх і кулацкіх плянаў, змыкацца з контр-рэвалюцыйнымі сіламі. Адначасова з гэтым ЦК КПЗБ падкрэсьлівае ў сваёй рэзалюцыі, што посьпехі нашага будаўніцтва выклікаюць у лягеры міжнароднай і польскай контр-рэвалюцыі ўзмацненьне тэмпаў падрыхтоўкі вайны. «Гэта падрыхтоўка выяўляецца таксама ў напружанай дзейнасьці польскага фашызму па заахвочаньні і арганізацыйным афармленьні сіл буржуазна-кулацкай контр - рэвалюцыі як у Заходняй Беларусі, так і на самой тэрыторыі БССР»—гаворыць рэзалюцыя ЦК КПЗБ.

Надзвычай важным палітычным моментам зьяўляецца гэтае падкрэсьліваньне ваенных плянаў польскага імпэрыялізму, сустрэчкай часткай якіх зьяўляецца арганізацыя і непасрэднае актыўнае падтрыманьне кулацкіх, нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў унутры БССР. Польская прэса пасьля апублікаваньня камунікату АДПУ аб арышце групы нацдэмаў узмоцнена прасавала паказаць сабе «нявінным агнцам» і пры самай гнуснай кампаніі супроць нашай нацыянальнай палітыкі адначасова ўрачыста заяўляла, што польскія фашысты нічога супольнага ня маюць з беларускімі нацдэмамі. Рэзалюцыя ЦК КПЗБ зусім правільна выпукляе момант падрыхтоўкі вайны, які цесна зьвязваецца з актывізацыяй нацыяналістычных элемэнтаў у БССР, актывізацыяй іх надзей на інтэрвэнцыю з боку міжнароднага і польскага імпэрыялізму. Зразумела, што адсюль вынікаюць і тыя адказныя задачы, якія стаяць перад нашай брацкай КПЗБ у галіне мабілізацыі шырокіх працоўных мас на абарону іх сацыялістычнай бацькаўшчыны — СССР, у галіне дэмаскаваньня ваенных плянаў польскага імпэрыялізму і яго шматлікіх агентаў. Адсюль вынікаюць і задачы, якія стаяць перад КП(б)Б у галіне цьвёрдага і няўхільнага дзяйсьцяўленьня ленінскай лініі на непрымірымую барацьбу супроць клясавых ворагаў, на завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны.

ЦК КПЗБ у сваёй рэзалюцыі паказвае на тую сувязь, якая злучана і злучае беларускіх нацыянал - фашыстаў з нацыянал - дэмакратамі. Аналіз ідэалёгіі і ўсёй работы беларускіх нацыянал-фашыстаў у Заходняй Беларусі дае магчымасьць нам яшчэ больш поўна высьветліць ідэалёгію і беларускіх нацыянал-дэмакратаў. Наш партыйны друк заўсёды падкрэсьліваў, што беларускія нацыянал - дэмакраты зьяўляюцца вернымі саюзьнікамі беларускай контр-рэвалюцыі за рубяжом. Мінулае групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў і беларускіх нацыянал-фашыстаў, якія працуюць у ЗБ пад крылкам польскіх акупантаў, — АДЗІНАЕ. Амаль большасьць з іх, разам, нага ў нагу з Луцкевічам і падобнай яму контр-рэвалюцыйнай «братняй» змагаліся пад сьцягамі «БНР» супроць рэвалюцыі, супроць утварэньня Беларускай Савецкай рэспублікі. Многія з іх вярнуліся ў свой час у БССР проста з пуцкавіцкага асяродзішча, вярнуліся са сваімі нацыяналістычнымі плянамі, плянамі буржуазнага перараджэньня БССР і падрыхтоўкі грунту для інтэрвэнцыі замежнага капіталу.

Папітычнае «крэдо» групы беларускіх нацдэмаў, арыштаваных органамі АДПУ, і беларускага нацыянал-фашызму ў Зах. Беларусі ў цяперашні пэрыяд таксама, як і ў мінулым—АДЗІНАЕ. Іх аб'яднаная адзіная клясавая база і адзіныя па сутнасьці пляны і імкненьні. Вайна супроць БССР, зьвяржэньне пралетарскай дыктатуры, устаноўленьне фашысцкай дыктатуры цаной ператварэньня БССР у калёнію польскага капіталу, зварот зямлі памешчыкам, фабрык капіталістам — вось праграма абодвух атрадаў беларускай контр-рэвалюцыі.

Калі мы возьмем усю работу беларускага нацыянал - фашызму ў ЗБ, калі мы супаставім папітычныя выступленьні Луцкевіча, Астроўскага, а ў эпошні час і «неваўўленага» нацыянал-рэнэгата Акінчыца з артыкуламі, выступленьнямі, і ўрэшце, самымі прызнаньнямі Лёсіка, Некрашэвіча, Ластоўскага і іншых, атрымпіваецца дзіўнае супаданьне пэўнугаў, установак і праграмных канцэпцый.

Зусім правільна яшчэ 4-ты пленум ЦК КПЗБ падкрэсьліваў, што «ЯК БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛ - ДЭМАКРАТЫЯ Ў БССР, ТАК І НАЦЫЯНАЛ-ФАШЫЗМ У ЗБ зьяўляюцца тэй сілай, якая ня толькі ідэалёгічна і папітычна рэдзе падрыхтоўку да падбою БССР, але ўжо цяпер арганізуе непасрэднае ўзброенае выступленьне супроць СССР. Беларуская контр-рэвалюцыя ўжо цяпер рыхтуецца выступіць яшчэ больш актыўна, чым у гады грамадзянскай вайны 1918-29 г.г.), узброеным атрадам польскага і міжнароднага імпэрыялізму ў вайне супроць СССР».

Супаданьне клясавых імкненьняў і мэт адбываецца паміж беларускімі нацдэмамі і нац.-фашыстамі ня толькі на глебе пытаньняў барацьбы супроць пралетарскай дыктатуры ў БССР. Беларускія нацыянал-дэмакраты цалкам і поўнасьцю салідарызаваліся з палітыкай і канкрэтнымі паводзінамі Луцкевіча і інш. у Заходняй Беларусі і таксама аказвалі яму канкрэтную і непасрэдную дапамогу. Некрашэвіч, Ластоўскі, Лёсік, яны таксама, як і Луцкевіч, стараліся быць «духоўнымі бацькамі», правадырамі, ідэолёгамі беларускай контр-рэвалюцыі ПА АБОДВА БАКІ МЯЖЫ. ЦК КПЗБ надзвычай правільна падкрэсьлівае наступны вельмі важны момант: «ЗНАХОДЗЯЧЫСЯ Ў ЦЕСНАЙ СУВЯЗІ З ФАШЫСЦКАЙ ГРУПАЙ ЛУЦКЕВІЧА - АСТРОЎСКАГА, БЕЛАРУСКІЯ НАЦЫЯНАЛ - ДЭМАКРАТЫ ІМКНУЛІСЯ ЎПЛЫВАЦЬ НА АРГАНІЗАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВАЛЕНЧАГА РУХУ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ, ІМКНУЧЫСЯ АЎЛАДАЦЬ ІМІ І НАКІРАВАЦЬ ІХ ДЗЕЙНАСЬЦЬ НА ЗГОДУ З ПОЛЬСКАЙ АКУПАЦЫЯЙ І НА БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ДЫКТАТУРЫ ПРАЛЕТАРЫЯТУ Ў БССР». У сваёй рабоце арыштаваная група нацдэмаў не абмяжоўвалася толькі БССР. Яна прабавала сабраць «воедино» контр-рэвалюцыйныя сілы, арганізаваць іх з разьлікам на тое, што ў часе вайны яны стануць АДЗІНЫМ ЦЭНТРАМ БЕЛАРУСКАЙ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ ЗБ і БССР. Невыпадкова яшчэ ў 1923 годзе пад выглядам кнігавыдавецтва «Адраджэньне», а пазьней пад выглядам розных «навукова - дасьледчых» гурткоў, выкарыстоўваючы Акадэмію Навук, беларускія нацдэмы імкнуліся сьцягнуць і арганізаваць вакол сябе рад выдатных контр-рэвалюцыйных дзеячоў, якія знаходзіліся за межамі. Прызнаньні саміх арыштаваных нацдэмаў паказваюць, што яны на пасяджэньнях свайго кіруючага цэнтру вельмі часта займаліся пытаньнямі канкрэтнага работы паміж замежнай контр-рэвалюцыяй і нацдэмамі БССР. На гэтых пасяджэньнях распрацоўваліся канкрэтныя даручэньні і пляны гутарак, якія павінны былі праводзіць па заданьнях цэнтру тыя, хто выяжджаў з заграничнымі камандыроўкамі ў Польшчу, Нямеччыну, Латвію і г. д. Невыпадкова ў «габінэт міністраў» будучага контр-рэвалюцыйнага ўраду вызначаўся Луцкевіч, Балаховіч і інш. прадстаўнікі беларускага нацыянал-фашызму. Яшчэ ў часе існаваньня на ЗБ «Беларускай Рабоча-Сялянскай Грамады» нацдэмы імкнуліся дапамагчы Луцкевічу і яго прыяцелям захапіць у свае рукі кіраўніцтва «Грамадой» з тым, каб гэту рэвалюцыйную арганізацыю ператварыць у згодніцкую нацыяналістычную арганізацыю. Такім чынам гэтыя канкрэтныя факты пацьвярджаюць, што паміж нацдэмамі і нацыянал-фашыстамі існавала сувязь і кантакт як па пытаньнях контр - рэвалюцыйнай працы ў БССР, так і па пытаньнях нацыянал-фашысцкай дзейнасьці ў Зах. Беларусі. Дэмаскаваць гэту сувязь перад шырокімі працоўнымі масамі Беларусі, як гэта робіць рэзалюцыя ЦК КПЗБ, дэмаскаваць гэту сувязь перад працоўнымі Савецкай Беларусі, як гэта рабіла і робіць КП(б)Б, гэта значыць прэцістаўляць адзінаму фронту беларускай контр-рэвалюцыі — вернага саюзьніка польскага імпэрыялізму—АДЗІНЫ ФРОНТ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ МАС РАБОЧАЙ КЛЯСЫ І ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА ПАД СЬЦЯГАМ КАМУНІЗМУ.

ЦК КПЗБ у сваёй рэзалюцыі ясна падкрэсьлівае сваю поўную згоду з усёй палітыкай КП(б)Б і де бальшавіцкага ЦК, з тэй барацьбой, якую праводзяць пад кіраўніцтвам КП(б)Б працоўныя масы БССР супроць нацдэмаў. ЦК КПЗБ адначасова з гэтым зусім ясна прызнае правільнай барацьбу супроць нацыянал-апартуністычных элемантаў і ўсе тыя арганізацыйныя мерапрыемствы, якія прынятыя ЦК КП(б)Б у галіне ачысткі партыйных радоў ад агентаў клясавага ворага. Такім чынам, ЦК КПЗБ цалкам салідарызуецца з мерапрыемствамі, накіраванымі супроць нацыянал-апартуністаў Жылуновіча, Ігнатоўскага, Прышчэпава, Баліцкага, якія былі нічым іншым, як непасрэднымі прадстаўнікамі беларускіх нацдэмаў і якія праводзілі ІХ ПАЛІТЫКУ І ІХ ПЛЯНЫ. Такім чынам, ЦК КПЗБ выказвае сваю поўную згоду з тымі мерапрыемствамі, якія правёў ЦК КП(б)Б і ў адносінах да Васілевіча, зьнятага з адказнага поста другога сакратара ЦК КП(б)Б.

Рэзалюцыя ЦК КПЗБ правільна характарызуе ўсе гэтыя элемэнты, як «агентуру і рупар клясавага ворага ўнутры партыі», як «праваднікоў беларускага шавінізму». ЦК ПЗБ вітае пастанову пленуму ЦК КП(б)Б аб НЕСУМЯШЧАЛЬНАСЬЦІ НАЦЫЯНАЛ - ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПОГЛЯДАЎ З ПРАБЫВАНЬНЕМ У РАДОХ ПАРТЫІ.

Таксама, як нацыянал - дэмакраты імкнуліся ўплывець на нацыянальна-вызваленчы рух у ЗБ, так і іх нацыянал-апартуністычныя агенты імкнуліся канцэнтраваць нацыянал - апартуністычныя элемэнты і ў КПЗБ, зрастаючыся цалкам—і ідэалёгічна, і арганізацыйна—з гэтымі элемэнтамі.

Рэзалюцыя ЦК КПЗБ зусім правільна прыміне ве «сацэсію», якая ў 1924 годзе адыйшла ад КПЗБ і паставіла слабе за межамі партыі і нацыянальна-вызваленчага руху. Яшчэ 3-я канфэрэнцыя КПЗБ тэй акрэсьлівала сутнасьць сацэсіяніцкай групы, на чале якой стаяў вядомы праваахтар Гурык (Маразоўскі): «Ідэалёгія гэтай групы, вядома пад назвай «Сацэсіі» ці камунікатычкаў, выражаецца ў наступным: а) поўны адказ ад ідэі гегемоніі пралетарыяту; б) немарксыцкая пастаноўка пытаньня аб сялянстве і «беларускім працоўным народзе», у якім няма клясавага расславаньня і клясавай барацьбы; в) нявер'е ў рэвалюцыйныя сілы польскага пралетарыяту, абвяшчэньне поўнай самастойнасьці беларускага рэвалюцыйнага руху (?), адмаўленьне ад прынцыпу дэмакратычнага цэнтралізму ў партыі»... Ужо па гэтай характарыстыцы «Сэцэсіі», якая дана ёй 3-й канфэрэнцыяй КПЗБ, можна бачыць поўную палітычную падобнасьць яе сутнасьці з сутнасьцю нацыянал-апартуністычнай ідэалёгіі, канкрэтнымі прадстаўнікамі якое былі ў КП(б)Б Жылуновіч, Ігнатоўскі, Прышчэпаў і інш. Невыпадкова таму, што нацыянал-апартуністычныя элемэнты ў КП(б)Б спачуваілі і падтрымлівалі сэцэсіяніцкія элемэнты, будучы па сваёй палітычнай сутнасьці ягадамі аднаго і таго-ж нацыяналістычнага поля. Невыпадкова, што і ў апошні час нацыянал-апартуністычныя элемэнты з КП(б)Б стараліся стаць на чале нацыяналістычных элемэнтаў з КПЗБ. Двурушніцкі прыкрываючыся на словах поўнай згодай з палітыкай ЦК КПЗБ, нацыянал-апартуністы з КП(б)Б па сутнасьці як у пытаньнях палітыкі КП(б)Б, так і ў пытаньнях палітычнай лініі КПЗБ былі агентамі варожых клясавых сіл, былі рупарам клясавага ворага, імкнуліся сарваць ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Тав. ШАРАНГОВІЧ у сваім выступленьні на Менскім партактыве цытаваў паказаньні Васілевіча ў ЦКК КП(б)Б, дзе гэты апошні сам прымушан быў прызнаць, што яго паводзіны і паводзіны іншых нацыянал-апартуністычных элемэнтаў у КП(б)Б на справе тармазілі, зрывалі цьвёрдае ажыцьцяўленьне бальшавіцкай нацпалітыкі і сваю групавую, антыпартыйную барацьбу процістаўлялі бальшавіцкай лініі партыі і ее ЦК.

ЦК КПЗБ падкрэсьлівае ў сваёй рэзалюцыі, што толькі «дзякуючы правільнай ленінскай палітыцы па нацыянальным пытаньні і бязьлітаснай барацьбе на два фронты, брацкая КП(б)Б пры падтрыманьні працоўных усяго СССР і пад кіраўніцтвам УсеКП(б) пераможна вядзе краіну да сацыялізму»...

Мы горача вітаем тую рашучую барацьбу, якую вядзе КПЗБ, як неадлучная частка бальшавіцкай КПП, пад кіраўніцтвам ЦК КПЗБ і ЦК КПП, за бальшавізацыю сваіх радоў, супроць права-апартуністычнай групы Варскага-Кастшэвы, супроць «левых» авантурнікаў і двурушнікаў, супроць нацыянал-апартуністаў і прымірэнцаў.

Няхай жыве наша брацкая КПЗБ і яе Цэнтральны Камітэт!

Няхай жыве КПП і ЦК КПП!

РЭЗАЛЮЦЫЯ ЦК КПЗБ

АБ ВЫКРЫЦЬЦІ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ НАЦ.-ДЭМАКРАТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ Ў БССР І ЎЗМАЦНЕНЬНІ БАРАЦЬБЫ З НАЦ.-АПАРТУНІЗМАМ

З посьпехам перамагаючы буйнейшыя затрудненьні будаўніцтва сацыялізму ў надзвычай адсталай краіне, якой зьяўлялася Беларусь, якая прынячвалася на працягу вякоў царызмам, КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго бальшавіцкага ЦК, уступае ў трэці рашаючы год пяцігодкі з зьвялізарнымі дасягненьнямі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, тэмпы якога перавышаюць тэмпы росту СССР у цэлым. Буры тэмп індустрыялізацыі краіны, рост валавой прадукцыі ў 1930 г. на 69 проц. супроць 1929 г., рост сацыялістычнага сэктару ў сельскай гаспадарцы на аснове калектывізацыі, ахапіўшай звыш 17 проц. усёй пасеўнай плошчы, і ліквідацыя кулацтва як клясы, поўная ліквідацыя беспрацоўя, рост пралетарскіх кадраў і разьвіцьцё беларускай пралетарскай культуры — усё гэта сьведчыць аб пераможным правядзеньні грандыёзнага плану сацыялістычнага будаўніцтва і поўнасьцю забясьпечвае ажыцьцяўленьне ў БССР пяцігодкі за чатыры гады.

Гэта пераможнае наступленьне сацыялізму абдываецца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы ўнутры краіны, ва ўмовах шалёнага супраціўленьня недабіткаў буржуазіі, а ў першую чаргу беларускага кулацтва і выяўнікоў яго клясавых інтарэсаў — беларускіх нацыянал-дэмакратаў, ва ўмовах барацьбы супроць агента клясавага ворага ўнутры партыі — правага апартунізму і яго рознавіднасьці нацыянал-апартунізму.

З другога боку, гэта наступленьне сацыялізму ў БССР, якая мяжуецца непасрэдна з капіталістычным сьветам і яго фарпостам — фашысцкай Польшчай — адбываецца ва ўмовах навіснай непасрэднай пагрозы ваеннай інтэрвэнцыі міжнароднага і польскага імпэрыялізму, які імкнецца захапіць і акупаваць БССР і УССР, разбурыць вялікую справу пралетарскай рэвалюцыі, адначіць панаваньне капіталу над рабочай клясай і працоўным сялянствам БССР.

Посьпех сацыялістычнага будаўніцтва выклікае ў лягеры міжнароднай і польскай контр-рэвалюцыі ўзмацненьне тэмпаў падрыхтоўкі ваеннай інтэрвэнцыі. Гэта падрыхтоўка выяўляецца таксама ў напружанай дзейнасьці польскага фашызму па заахвочаньні і арганізацыйным зфармленьні сіл буржуазна-кулацкай контр-рэвалюцыі, як у Зах. Беларусі, так і на самой тэрыторыі БССР.

Аб актыўнасьці контр-рэвалюцыйных элемэнтаў і актыўнай дапамозе ім з боку польскага фашызму сьведчыць выкрытая органамі ДПУ контр-рэвалюцыйная арганізацыя беларускіх нацыянал-дэмакратаў, пралезшых пры іх салідэйнасьці на важнейшыя пасты ў савецкай дзяржаве (Наркамэм, Наркамасьветы, Дзяржвыдавецтва, БАН і інш.), ва ці барацьбу супроць бальшавіцкай лініі партыі, змыкаючыся поўнасьцю з контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам, Нацыянал-апартуністычныя тэорыі, якія разьвіваліся Жылуновічам, Прышчэпавым, Баліцкім, Ігнатоўскім і інш. аб адсутнасьці кулацкай верхавінкі ў беларускай вёсцы, аб большай рэвалюцыйнай ролі беларускага селяніна параўнальна з пралетарыятам, тэорыі, прыпісваючыя рэвалюцыйную ролю буржуазна-ліберальнаму «нацыянальскаму» руху, шукаючы ў ім, а не ў пралетарскім руху, на чале якога стаяць бальшавікі, папарэдніка камартыі Беларусі, тэорыі, якія бацаць за ўсіх гэтых рысах нацыянальную самабытнасьць беларускага народу, самабытнасьць гістарычнага працэсу ў Беларусі, мелі мэтай затушаваць клясавыя супярэчнасьці ў Беларусі і зьяўляюцца нічым іншым, як выкананьнем сацыяльнага заказу беларускай контр-рэвалюцыі і цалкам сунадаюць з тэорыямі беларускага нацыянал-фашызму.

ЦК КПЗБ вітае пастановы пленуму ЦК КП(б)Б аб несумяшчальнасьці нацыянал-апартуністычных поглядаў са знаходжаньнем у партыі, а таксама арганізацыйныя высновы, дастасаваныя да носьбітаў нацыянал-апартунізму, і далам падтрымлівае правільную ленінскую лінію ЦК КП(б)Б у нацыянальнай палітыцы, непрымірымую барацьбу супроць усякіх нацыяналістычных ухілаў, а ў першую чаргу супроць расійскага вялікадзяржаўнага ўхілу, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай, усямерна ўзмацняючы барацьбу з праяўленьнямі беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму іншых колераў.

ЦК КПЗБ адзначае, што толькі дзякуючы правільнай ленінскай палітыцы па нацыянальным пытаньні і бязьлітаснай барацьбе на два фронты, брацкая КП(б)Б пры падтрыманьні працоўных усяго СССР і пад кіраўніцтвам УсеКП(б), пераможна вядзе краіну да сацыялізму, руйнуючы па сваім шляху ўсе перашкоды, якія ставяцца як зьнешнімі, так і ўнутранымі ворагамі пралетарскай дыктатуры.

Партыя наша, папулярызуючы сярод мас дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва БССР, павінна ўзмацніць барацьбу супроць беларускага нацыянал-фашызму і правесьці шырокую кампанію ў сувязі з выкрыцьцём контр-рэвалюцыйнай беларускай нацыянал-дэмакратычнай арганізацыі, што яшчэ нацьвярджае, наколькі вялікі і актуальна небясьпека ваеннага нападу з боку фашысцкай Польшчы на СССР і а нязвычайнай яркасьцю выкрывае контр-рэвалюцыйную ролю беларускага нацыянал-фашызму і яго роднага брата — нацыянал-дэмакратызму, гэтага саюзьніка і агента польскага фашызму ў арганізацыі вайны і барацьбы супроць дыктатуры пралетарыяту ў БССР і рэвалюцыйнага руху ў Зах. Беларусі.

Адначасова КПЗБ павінна завастрыць увагу на барацьбу з праскяньнем агентаў беларускага нацыянал-фашызму ў арганізацыі нацыянальна-вызваленчага руху і яго ўплывам як на арганізацыі гэтага руху, так і на пасасобныя зьвены нашай партыі. Дзейнасьць агентаў беларускага нацыянал-фашызму ў белостоцкай і гораДзенскай арганізацыях ТВШ, першамайская дэманстрацыя з удзелам камсамольцаў у адным з раёнаў ГораДзенскай акругі з нацыяналістычнымі беларускімі сьцягамі, невыстарчальная барацьба з боку белостоцкага АК і камфракцыі ў арганізацыях нацыянальна-вызваленчага руху супроць агентаў нацыянал-фашызму, хістаньне ў сувязі з маняўрам фашысцкага ўраду вакол дэпутатаў б. Грамады, невыстарчальна разгорнутая дзейнасьць па выкрыцьці гэтага маняўру, — усё гэта сьведчыць як актуальна гэта небясьпека. Набліжэньне вайны, якая яшчэ больш абвострыць клясавыя антаганізмы і яшчэ больш узмоцніць напіск нацыянал-фашызму, патрабуе ад партыі яшчэ большай чуласьці ў барацьбе супроць уплыву нацыянал-фашызму і нацыянал-апартуністычных ухілаў у сваіх радох.

Пятрыя навіна разгарнуць шырокі фронт барацьбы з нацыянал-апартуністычнымі тэорыямі, якія знайшлі сваё адлюстраваньне і ў КПЗБ. ЦК КПЗБ спачатку раскрытыкаваў нацыянал-апартуністычныя ўстаноўкі ў нашай партыі, адтак, да гэтага часу не разгорнута яшчэ даволі шырокая сыстэматычная работа па барацьбе з нацыянал-апартуністычнымі тэорыямі і нацыянал-апартуністычнымі праяўленьнямі на практыцы. Неабходна згуртаваць асаблівую ўвагу на асьвятленьне сутнасьці нацыянал-апартуністычных тэорый, карэньняў і клясавага значэньня так званай «сэцэсіі» у 1924 г., ролі беларускага нацыяналістычнага адраджэньскага руху, яго непасрэдной сувязі з цяперашнім беларускім нацыянал-фашызмам і ўплывам яго на беларускі нацыянальна-вызваленчы рух і сувязь яго з нацыянал-апартуністычнымі ўхіламі ў нашай партыі. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы зьяўляецца неабходнай умовай для выкананьня партыяй яе ролі на кіраўніцтве барацьбой мас супроць фашысцкай дыктатуры і яе акупацыі.

Віньня, сьнежань 1930 г.

Другі Усебеларускі зьезд Асоавіяхіму

Прамова тав. М. М. Галадзеда

Таварышы, з часу 1-га Усебеларускага зьезду Асоавіяхіму прайшло 2 гады і 8 месяцаў.

За гэты час у нашай дзяржаве адбыліся вялікія сацыяльна-эканамічныя зрухі. Сутнасьць таго, што адбылося ў нашай дзяржаве за гэты час, заключаецца ў тым, што наша партыя і савецкая ўлада здолелі на практыцы шырока і з посьпехам ажыцьцяўляць асноўны лёзунг т. Леніна аб індустрыялізацыі краіны і аб сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі.

Гэтыя карэнныя задачы намі выконваюцца з вялікім посьпехам. Сутнасьць справы заключаецца ў тым, што наша дзяржава знаходзіцца на такім этапе сацыялістычнага будаўніцтва, калі мы ўжо змаглі стварыць такую тэхнічную і індустрыяльную базу нашай народнай гаспадаркі, якая дазволіла нам зрабіць круты паварот у адносінах да сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі па шляху яе калектывізацыі.

На падставе посьпехаў індустрыялізацыі мы маем масавы паварот бядняцка-серадняцкай масы ў калгасы. Цяпер наша дзяржава знаходзіцца на крутым уздыме сацыялістычнага будаўніцтва. Цяпер рабочая кляса і працоўнае сялянства, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, узышлі на круты перавал сацыялістычнага шляху. Мы ўступілі ў 3-ці і рашаючы год пяцігодкі. Ажыцьцяўленьне пляну 3-га году пяцігодкі ёсьць і будзе завяршэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Сучасны этап сацыяльнай рэвалюцыі адначае сабой уваход нашай дзяржавы ў пэрыяд сацыялізму. Гэты этап сацыялістычнага будаўніцтва адначае сабою і тое, што наша дзяржава ўступіла ў пэрыяд разгорнутага — шырокім пралетарскім фронтам у саюзе з асноўнымі масамі сялянства — сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элэменты гораду і вёскі.

Мы ўступілі ў 3-ці год пяцігодкі з вялікімі посьпехамі на выкананьні пляну першых двух год на ўсіх рашаючых галінах народна-гаспадарчага будаўніцтва. Мы прышлі да 3-га году пяцігодкі са значным перавыкананьнем намячэньняў пяцігодкі. Гэта дало магчымасьць рабочай клясе Савецкага Саюзу, разам з калгаснікамі і бядняцка-сераднякам сялянствам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, намеціць народна-гаспадарчы план на 1931 год са значна большымі тэмпамі, чым гэта практыкавалася пяцігодкай і чым былі тэмпы ў першыя два гады пяцігодкі.

Тыя магчымасьці, якія былі ў нашай дзяржавы для пабудовы сацыялізму за гэтыя два гады значна павялічыліся. Нашы магчымасьці набылі яшчэ новыя крыніцы энэргіі, якія даюць нам упэўненасьць у выкананьні генэральнага лёзунгу партыі — «Пяцігодка — за чатыры гады».

За гэтыя першыя два гады пяцігодкі мы бачым вялізарныя праявы з боку пралетарыяту новых сацыялістычных форм працы: разьвіцьцё сацыялістычнага спаборніцтва, ударных мэтадаў працы, пераход на бесьперапынны тыдзень, арганізацыя вытворчых камун на прадпрыемствах і г. д. — усё гэта зьяўляецца прадуктам ініцыятывы найшырэйшых рабочых мас. Гэта адначасова зьяўляецца вялізарнай, нявымернай і невычарпальнай крыніцай праяўленьня пралетарскай энэргіі, якая навіна быць накіравана на сацыялістычную рэканструкцыю ўсяе народнае гаспадаркі. Гэта справа дала нам магчымасьць перавыкаваць асноўныя паказальнікі пяцігодкі ў першыя два гады. Фактар разгортваньня пралетарскага творчага энтузіязму і перавыкананьня нашых мерапрыемстваў. Не магла не абвастрацца клясавая барацьба таму, што мы знаходзімся ў пэрыядзе фактычнага ажыцьцяўленьня ленінскіх ідэй — зьнічтаньня клясаў.

На падставе дасягненьняў індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі наша пралетарская дзяржава змагла шчыльна прыступіць да ліквідацыі апошняй капіталістычнай клясы — кулацтва. Кулацтва не змагло добраахвотна, без бойкі, здаць свае пазыцыі. Сваё супраціўленьне клясавы вораг удзесяцярыў, павялічыў яго ў сто раз. Ён імкнуўся і імкнецца зрынуць мерапрыемствы савецкай улады і партыі, накіраваныя на ўзмацненьне пралетарскай дыктатуры і на сацыялістычную перабудову ўсёй народнай гаспадаркі.

У праяўленьні свайго клясавага супраціўленьня кулак меў і сваіх саюзьнікаў, сваіх ідэолёгаў, сваю агентуру. Ідэолёгамі варожай кулацкай нам клясы зьяўляліся шкодніки, рэшткі буржуазнай інтэлігенцыі, рэшткі контр-рэвалюцыйных нацдэмакратаў, якія, зьяўляючыся прыхільнікамі капіталістычнай сыстэмы, зьяўляючыся саюзьнікамі кулака, зьявіліся адначасова і ідэолёгамі варожай нам адміраючай клясы.

Кулакі змаглі знайсьці сваю агентуру і ўнутры нашай партыі. Гэтымі агентамі зьяўляліся наўстойлівыя правапартуністычныя і нацыянал-апартуністычныя элэменты. Наша партыя змагла ненахісна і з посьпехам правесьці лінію, лінію выцьвёрдую ленінскую лінію, лінію выразнай клясавай барацьбы, перамагаючы клясавага ворага, кулака, нашмачы клясавага ворага, кулацтва як на, шкодніка, ліквідуючы кулацтва як клясу. Партыя адначасова змагла навесьці руйнуючы ўдар кулацкім агентам у нашай партыі, правым апартуністам, якія абаранялі рабскія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва і цягнулі нашу краіну да рэтаўрацыі капіталізму. Клясавы вораг цярпіць паражэньне, але ён яшчэ цалкам не дабіт. Мы толькі нанесьлі яму руйнуючы ўдар. Такі сама і правы апартунізм, як агентура клясавага ворага, яшчэ канчаткова не ліквідаван. Мы толькі выкрылі яго да канца і нанесьлі яму руйнуючы ўдар, але правы апартунізм і надалей зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва.

На барацьбу з гэтай галоўнай небясьпекай у нашай партыі, на барацьбу з праваапартуністычнымі, бухаркрытычнымі і шкоднымі элэментамі ў сапраўдным ваяраце, на справу ліквідацыі кулацтва як клясы, на шырокае разгортваньне сацыялістычнага наступленьня мы і павінны мабілізаваць усе нашы пазыцыі ячэйкі Асоавіяхіму, усіх членаў нашай арганізацыі. Тое, што клясавая барацьба абвастраецца, гэта, клясавая барацьба абвастраецца, гэта, коді абвастрэньне клясавай барацьбы ціпер праўляецца на вёсцы вакол калектывізацыі.

Пастановай XVI зьезду УсеКП(б) устаноўлена, што да канца пяцігодкі павінна быць ахоплена калектывізацыяй усё бядняцка-сераднякае сялянства. Пастанова апошняга аб'яднаньня пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) дае ўстаноўку на тое, каб у калгасы было аб'яднана ў 1931 г. ня менш 50 проц. усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Пры правядзеньні гэтай асноўнай і генэральнай працы на сацыялістычнай перабудове сельскае гаспадаркі, працы найбольш цяжкай і складанай, якая закранае мільёны бядняцка-серадняцкага сялянства, якая пераробляе карэнным чынам усе эканамічныя, бытавыя і псыхалёгічныя адносіны ў вёсцы, — мы павінны ўлічваць складанасьць гэтай працы.

Неразумеьне значэньня сацыяльнай калектывізацыі, а таксама неразуменьне складанасьці гэтай задачы прывядзе да скаканьня, з аднаго боку, да пазыцыі правага апартунізму на практыцы і да скаканьня на пазыцыі галавацяпаў і перагібшчыкаў, якія таварылі: «нам усё ніпачом» і г. д.

Правядзеньне сацыяльнай калектывізацыі патрабуе вялізарнай арганізаванасьці ўсіх нашых арганізацый у горадзе і на вёсцы, і, з другога боку, патрабуе сур'ёзнага і глыбокага падыходу да канкрэтных умоў вёскі.

Улічваючы важнасьць і складанасьць гэтай задачы, мы павінны праяўляць максымум умельня ў працы і зусім выразную клясавую лінію, на скаканьчыся з ленінскіх прынцыпаў у справе калектывізацыі, а таксама мы не павінны пасаваць перад труднасьцямі ў гэтай працы.

Бядняцка-сераднякая вёска сёньня знаходзіцца ў руху. Усе асноўныя масы бядняцка-сераднякага сялянства, якія да гэтага часу яшчэ былі не ў калгасах, таксама ўжо на шляху калектыв

Швэйныя фабрыкі ганебна пачалі трэці год

ВЫЗВАЛІЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВЫ АД НЯЗДОЛЬНЫХ КІРАВАЦЬ ВЫКАНАНЬНЕМ ПРАМФІНПЛЯНУ

Белшвэйаб'яднаньне шмат займаецца плянамі і мала робіць для іх выкананьня

ЗА СТУДЗЕНЬ НІ АДНА ШВЭЙНАЯ ФАБРЫКА НЯ ВЫКАНАЛА ПРАГРАМЫ. ФАБРЫКА «КАСТРЫЧНІК» ВЫКАНАЛА ЯЕ НА 94,7 ПРОЦ., «ПРАФІНТЭРН» — НА 89,3 ПРОЦ., «КАМІНТЭРН» — НА 85,6 ПРОЦ., ІМЯ ВАЛАДАРСКАГА — НА 79,7 ПРОЦ., «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» — НА 57,7 ПРОЦ., Ф-КА ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА—НА 100,8 ПРОЦ.

ПЛЯНЫ ФАБРЫК АБСАЛЮТНА РЭАЛЬНЫЯ І МОГУЦЬ БЫЦЬ НЯ ТОЛЬКІ ВЫКАНАНЫ, АЛЕ І ПЕРАВЫКАНАНЫ.

ПЕРШАЯ ПЯЦІДНЕЎКА ЛЮТАГА НЯ ТОЛЬКІ НЕ ПАЛЕПШЫЛА СТАНОВІШЧА, АЛЕ ЯШЧЭ БОЛЬШ ПАГЛЫБІЛА ПРАРЫЎ. ФАБРЫКА ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА ВЫКАНАЛА ПРАГРАМУ ТОЛЬКІ НА 70 ПРОЦ., «ПРАФІНТЭРН» — НА 85 ПРОЦ. І Ф-КА «КАСТРЫЧНІК» — НА 84 ПРОЦ. НА ФАБРЫКАХ «ПРАФІНТЭРН» І ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА — ВЯЛІКІЯ ЗАЛЕЖЫ НЯСКОНЧАНАЯ ПРАДУКЦЫЯ. НА СКЛАДАХ — ВЯЛІКІЯ ЗАПАСЫ СЫРЦУ.

НЕКАТОРЫЯ КІРАЎНІКІ ФАБРЫК ПРАВУЮЦЬ ТЛУМАЧЫЦЬ НЕВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ ПАТРАБАВАНЬЕЯМІ ПАЛЕПШЫЦЬ ЯКАСЬЦЬ. ТАКУЮ УСТАНОЎКУ ТРЭБА ЛІЧЫЦЬ АПАРТУНІСТЫЧНАЙ. ЗАДАЧА КОЖНАЙ ФАБРЫКІ — ДАЦЬ 100 ПРОЦ. ЯК ПА ЯКАСЬЦІ, ТАК І ПА КОЛЬКАСЬЦІ. НІХТО НЯ ДАВАЎ ФАБРЫКАМ ЗАДАНЬНЯ ВЫПУСКАЦЬ ПРАДУКЦЫЮ ГЕНСКАЙ ЯКАСЬЦІ.

ЗА ВЫКЛЮЧЭНЬНЕМ ФАБРЫКІ «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ», ЯКАЯ ПЕРАЖЫВАЕ ЯШЧЭ ПЭРЫЯД АРГАНІЗАЦЫІ, НІ АДНА З ІНШЫХ ФАБРЫК НЯ МАЕ ПРЫЧЫН АБ'ЕКТЫЎНАГА ХАРАКТАРУ ДЛЯ ПЕВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ.

БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНЕ ПАВІННА НЕАДКЛАДНА СТАЦЬ ТВАРАМ ДА СВАІХ ФАБРЫК І ДАБІЦЦА ПЕРАЛОМУ.

ГАЛОЎНЫ ЭКАНАМІСТ БЕЛШВЭЙАБ'ЯДНАНЬНЯ САВІЧ.

Тав. КЛЮЧЭНКА, ударнік чыгуначыцейнага заводу «Энэргія», прэміяваны за барацьбу за якасьць.

ФАБРЫКІ, ЯКІЯ ПЛЯТУЦЦА У ХВАСЬЦЕ

— Магілеўская фабрыка штучнага валакна выканала студзеньскую праграму на 94,5 проц. Процант першага і другога гатунку складае толькі 22,8 месячнай выпрацоўкі.

А. СТАПАЎ.

***

— Праграма за студзень на швэйнай фабрыцы «Камінтэрн» (Гомель) выканана на 85,7 проц. Тлумачыцца гэта тым, што нядаўна абноўленае кіраўніцтва піджачным і бручнымі цэхамі яшчэ не ўзялося па-баявому за ліквідацыю прарыву. Слаба працуюць вучасткові «трыкутнікі». За першую пяцідневку лютага прарыў павялічыўся: праграма на фабрыцы выканана на 80,2 проц. Аслабла кіраўніцтва сацспаборніцтвам і ударніцтвам. Пагоршыліся таксама якасныя паказальнікі, чаму спрыяла аслабленьне тэхнічнага кантролю.

Брыгада «Зьвязды»: Нявельская. Кауфман. Дулін.

***

— Фабрыка «Чырвоны Кастрычнік» (Мазыр) недавыканала пратрамы асобнага кварталу на 9,91 проц., а за студзень праграма невыканана на 2,82 проц. 15 студзеня быў абвешчан штурм для ліквідацыі прарыву. Але штурм, як відаць, не дамог. Зараз штурм працягнут да 15 лютага. Заводзкім фабрычным арганізацыям трэба перабудаваць сваю работу інакш і штурмы не дапамогуць.

Ярголін.

Бясплянавасьць — асноўная прычына прарыву

Віцебская акцыярная фабрыка пачала трэці год пяцігодкі, выканаўшы праграму асобнага кварталу на 102 проц. Але студзень характарызуецца значным зьніжэньнем тэмпаў. За студзень праграма выканана на 83,17 проц. Першая пяцідневка лютага дае далейшае зьніжэньне да 81,14 проц. І гэта на гледзячы на тое, што прамфінплян Белшваб'яднаньнем урэзан.

Ні адзін з цэхаў на выконвае пляну. Ганебна адстаюць шліфавальны і зборачна-аптычны цэхі.

Асноўная прычына невыкананьня праграм — бясплянавасьць, няправільная разьбіўка зьмен і няправільнае скарыстаньне рабочай сілы і абсталяваньня. Паміж цэхамі няма кантакту. Зносныя вэрштаты рамантуюцца несваячасова. Прагулы і спазьненьні, асабліва па прадасьцяражальным і шліфавальным цэхах, дасягаюць вялізарных разьмераў. Адміністрацыя прадасьцяражэнага цэху ня здолее забясьпечыць выкананьне праграмы, бо адносіцца да кіраўніцтва цэхам бездапаможна. Таксама нагнадляюцца перабоі ў падачы сыр-ду, матар'ялаў і паўфабрыкатаў. Зусім не адчуваецца барацьбы за якасьць.

Усе гэтыя факты ставяць пад пагрозу выкананьне прамфінпляну першага кварталу.

Роза Цэй.

„Бальшавік" не здае сваіх пазыцый

Гарбарня «Бальшавік» у Менску выканала студзеньскую праграму на 110,9 проц. у цэнавым азначэньні.

Менская абутковая фабрыка выканала праграму на 94,2 проц., гомельская абутковая—на 96,3 проц.

6 ГАДЗІН ПРАСТОЮ

З-ЗА НЯДВАЙНАСЬЦІ ЗАГАДЧЫКА ВЫТВОРЧАСЬЦІ т. ХАДАСЭВІЧА, А ТАКСАМА ЗАГАДЧЫКА ЧУРАЧНАГА ЦЭХУ, ЯКІЯ НЕ НАГРУЗІЛІ ПАРНІКІ, НОЧУЧУ 2-га ЛЮТАГА ФАБРЫКІ «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» І «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» МЕЛІ ПРАСТОЙ НА ПРАЦЯГУ 6 ГАДЗІН.

ВІНАВАТЫХ ТРЭБА ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЬЦІ.

БАГДАН МІХАСЬ.

Лесаапрацоўчыя заводы ня выконваюць пляну

ЛЕСАЦЭХ БАБРУЙСКАГА КАМБІНАТУ ВЫКАНАЎ СТУДЗЕНЬСКУЮ ПРАГРАМУ НА 96,5 ПРОЦ., ЗАВОД «ЗЬВЯЗДА» Ў КАПЦЭВІЧАХ—НА 77,9 ПРОЦ., ЗАВОД ІМЯ ТОМСКАГА Ў РЭЧЫЦЫ—НА 78 ПРОЦ., ЛЕСАЗАВОД У ПОЛАЦКУ—НА 82,6 ПРОЦ., ЗАВОД «АДРАДЖЭНЬНЕ»—НА 91,4 ПРОЦ.

Адміністрацыі ў цэхах ня відаць

ФАБРЫКІ «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» І «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» ЗАРАЗ РАСПЛАЧВАЮЦЦА ЗА ЧЕПСКУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ. СТУДЗЕНЬСКАЯ ПРАГРАМА ВЫКАНАНА ФАБРЫКАЙ «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» НА 94 ПРОЦ., А «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГАЙ»—НА 87,6 ПРОЦ. ПАСЬЛЯ ТАГО, ЯК «ЗЬВЯЗДА» Ў ПАЧАТКУ СТУДЗЕНЯ ЗАБІЛА ТРЫВОГУ, ФАБРЫЧНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І АДМІНІСТРАЦЫІ КРЫХУ ЗАВАРУШЫЛІСЯ. А ЗАРАЗ ЗНОЎ ПАЙШЛА СТАРАЯ СЬПІЧКА. УДЗЕНЬ НА ФАБРЫЦЫ ДЫРЭКТАРА АМАЛЬ НЯ ВІДАЦЬ, А НОЧУЧУ ЯГО НІКОЛІ ТАМ НЯМА. НЯ ВІДАЦЬ ТАКСАМА ІНШЫХ АДМІНІСТРАТАРАЎ, ЯКІХ У ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВЕ НАЛІЧВАЕЦЦА 10 ЧАЛАВЕК.

АСАБЛІВА ТРЭБА ПАДКРЭСЬЛІЦЬ НЯЎВАЖЛІВЫЯ АДНОСІНЫ ДА ЗАГАТОЎКІ АПАЛУ. ТОРФ ЗАРАЗ ПАДВОЗІЦЦА ВУСЕНІЧНЫМІ ТРАКТАРАМІ: ШТО ПРЫВОЗЯЦЬ—ЗА ДЗЕНЬ СПАЛЬВАЮЦЬ. МІЖ ТЫМ, ТРЭБА НАЗАПАСІЦЬ АПАЛУ НА ЛЕТА. КАЛІ ГЭТАГА НЯ БУДЗЕ ЗРОБЛЕНА, ФАБРЫКІ ПАСЭЛЯ ТАГО, ЯК ПАПСУЕЦЦА ДАРОГА, ПРЫМУШАНЫ БУДУЦЬ СПЫНІЦЬ РАБОТУ.

РАБОЧЫ.

Бясплянавасьць — асноўная прычына прарыву

Віцебская акцыярная фабрыка пачала трэці год пяцігодкі, выканаўшы праграму асобнага кварталу на 102 проц. Але студзень характарызуецца значным зьніжэньнем тэмпаў. За студзень праграма выканана на 83,17 проц. Першая пяцідневка лютага дае далейшае зьніжэньне да 81,14 проц. І гэта на гледзячы на тое, што прамфінплян Белшваб'яднаньнем урэзан.

Ні адзін з цэхаў на выконвае пляну. Ганебна адстаюць шліфавальны і зборачна-аптычны цэхі.

Асноўная прычына невыкананьня праграм — бясплянавасьць, няправільная разьбіўка зьмен і няправільнае скарыстаньне рабочай сілы і абсталяваньня. Паміж цэхамі няма кантакту. Зносныя вэрштаты рамантуюцца несваячасова. Прагулы і спазьненьні, асабліва па прадасьцяражальным і шліфавальным цэхах, дасягаюць вялізарных разьмераў. Адміністрацыя прадасьцяражэнага цэху ня здолее забясьпечыць выкананьне праграмы, бо адносіцца да кіраўніцтва цэхам бездапаможна. Таксама нагнадляюцца перабоі ў падачы сыр-ду, матар'ялаў і паўфабрыкатаў. Зусім не адчуваецца барацьбы за якасьць.

Усе гэтыя факты ставяць пад пагрозу выкананьне прамфінпляну першага кварталу.

Роза Цэй.

Прамова тав. Галадзеда*)

Адной з асноўных задач на будучы час зьяўляецца задача 100-процантнага ахопу ячэйкамі Асавіяхіму калгасьнікаў. Да гэтага часу мы маем дасягненьні на прыцягненьні калгасьнікаў у рады Асавіяхіму, але гэтыя дасягненьні нас задаволіць ня могуць. Калгасны сэктар расьце. Неабходна, каб увесь калгасны сэктар быў у радах Асавіяхіму. На мінулым зьезьдзе ў радах Асавіяхіму ня было ні аднаго калгасьніка, а да 2-га зьезду ў радах Асавіяхіму маецца 31,5 тыс. калгасьнікаў. Але гэтага мала. Трэба дабіцца таго, каб ячэйкі Асавіяхіму праскінулі ў самыя глыбінныя куткі вёскі, каб яны ахапілі ўсіх калгасьнікаў.

Таксама неабходна пашырыць уплыў Асавіяхіму на ўсю бядняцка-серадняцкую масу сялянства.

Наша арганізацыя Асавіяхіму зьяўляецца асноўнай масавай арганізацыяй на ўмацненьні абароназдольнасьці нашай краіны. Таму зусім справядліва патрабуюць ад нас камуністычная партыя, пралетарыят і ўся савецкая грамадзкасьць, каб Асавіяхім апраўдаў сваю задачу па актывізацыі мас для ўмацненьня абароназдольнасьці краіны.

Не павінна быць ні аднаго прадпрыемства, ні аднаго калгасу, ні адной вёскі, якая-б ня была ахоплена арганізацыямі Асавіяхіму. Растлумачыць кожнаму рабочаму, бедняку, серадняку, калгасьніку сэнс і патрэбу арганізацыі радоў Асавіяхіму. — гэта вялізарнейшая і адказнейшая праца.

Асавіяхім павінен навучыць усіх працоўных аўладаць зброяй для ажыцьцяўленьня сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Дазвольце, таварышы, выказаць надзею на тое, што 2-гі зьезд Асавіяхіму БССР, падагульваючы значны і багаты вопыт сваёй працы, бязьлітасна выкрываючы на падставе пралетарскай самакрытыкі ўсе нашы недахопы, а недахопаў у нашай працы вельмі многа, зможа намеціць далейшыя шляхі ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і вялізацыі працоўнага насельніцтва.

Наш зьезд павінен зацікавіць усе пралетарскія масы, усіх калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкае сялянства справай вялізацыі, справай абароназдольнасьці нашай краіны, а гэтыя задачы зьяўляюцца важнейшымі задачамі ўсяго нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Дазвольце выказаць надзею на тое, што наш зьезд зьявіцца сапраўдным мабілізуючым цэнтрам усіх пралетарскіх і працоўных мас на ўмацненьні абароназдольнасьці нашай краіны.

Наш зьезд павінен даць абяцаньне камуністычнай партыі, што пасьля 2-га зьезду мы зробім яшчэ адны буйны крок у справе прыцягненьня ў рады Асавіяхіму шырокіх мас пралетарыяту і працоўнага сялянства і на справе ажыцьцяўлення гэтае абяцаньне. Мы павінны запэўніць камуністычную партыю і савецкую ўладу, што арганізацыя Асавіяхіму, працуючы пад умацненьнем абароназдольнасьці нашай краіны, адначасова будзе актыўным удзельнікам вялікай сацыялістычнай будоўлі і на фронце індустрыялізацыі краіны, і на фронце сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Няхай жыве сацыялістычнае будаўніцтва!

Няхай жыве кіраўнік гэтага сацыялістычнага будаўніцтва — Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі бальшавікоў!

Няхай жыве правадыр сусьветнага пралетарыяту тав. Сталін!

Няхай жыве Асавіяхім — гэта масавая арганізацыя, якая вучыць пралетарыят уладаць зброяй для перамогі ў барацьбе за сусьветную пралетарскую рэвалюцыю!

(Гучныя воплескі, «інтэрнацыянал»).

*) Канец. Пачатак гл. на 2-й старонцы.

ПЛЯН ЗАГАТОЎКІ І АДГРУЗКІ ПУШНІНЫ-СЫРЦУ ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН

Адозва РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ МЕНСКАЙ ФУТРОВАЙ БАЗЫ ПУШНАСЫНДЫКАТУ ДА ЎСІХ ПУШНАЗАГАТОЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ І ДА ПАЛЯЎНІЧЫХ

Дарагія таварышы! Перад краінай Саветаў стаіць вялізарная задача па рэканструкцыі народнай гаспадаркі. Для гэтага патрабуецца максымум напружанай працы на павялічэньні ўнутраных рэсурсаў краіны, па паляпшэньні якасьці дабываемай прадукцыі. Гэта магчыма пры шырокім удзеле мас у сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Уступіўшы ў 3-ці рашаючы год, 5-я менская футравая база Пушнасындыкату абвясьціла сябе ўдарнай і перайшла на баявыя тэмпы працы. Мы заключылі сацдагавор са смаленскай базай Пушнасындыкату па перавыкананьні загатоўчых і адгрузачных плянаў, паляпшэньні якасьці пушніны, хутчэйшай адгрузцы на экспарт і прамысловасьці, зьніжэньні накладных і гандлёвых выдаткаў на 8 процантаў, і па сваячасовым давядзеньні загатоўчых плянаў. Вось 5 асноўных момантаў нашага сацдагавору.

Студзеньскі план адгрузак на экспарт і прамысловасьці выканан усяго на 67,5 проц., прычым да 30-га студзеня адгружан ўвесь тавар, што знаходзіўся на базе.

Гэта ганебная лічба ставіць пад пагрозу арыву пастановы ўраду аб выкананьні плянаў па адгрузцы на экспарт і прамысловасьці пушніны-сырцу.

Люты павінен зьявіцца ударным месяцам, каб ліквідаваць студзеньскі прарыў на загатоўчым фронце на пушсырцы.

Ліквідацыя прарыву патрабуе ад усёй загатоўчай сеткі пераключэньня сваёй працы на ўдарныя тэмпы і ставіць перад кожным загатоўшчыкам, таварыствам паляўнічых наступныя задачы:

1. Мабілізаваць грамадзкую думку вакол выкананьня лютаўскага пляну і навярстаньня студзеньскага прарыву шляхам 100-проц. ахопу сацспаборніцтвам раённых загатпунктаў, таварыстваў паляўнічых, калгасаў і паляўнічых. Давесьці загатоўчыя пляны да кожнага працаўніка пізавога пункту, калгасу і паляўнічага.

2. Паскорыць адсылку пушсырцу і дабіцца, каб да 24-га кожнага месяца на пунктах і раёнах не заставалася рэштак.

3. Палепшыць якасьць пушсырцу шляхам правядзеньня растлумачальнай працы па правільным кансэрваваньні і сваячасовай сушцы паводле дзяржстандарту.

4. Сваячасова дасылаць дзённыя весткі аб ходзе загатовак цэнтральным праўленьням. Сваячасова высылаць спэцыфікацыі і рахункі на адпраўлены пушсырц непасрэдна менскай футравай базе.

5. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на фарсаваньне загатоўкі і хутчэйшую адпраўку пушсырцу, асабліва кошкі, сабакі, труса, каб забясьпечыць бесьперабойную працу футравых фабрык, у бліжэйшы-ж тэрмін распачаць падрыхтоўчую працу да сэзону здабычы кратоў.

Лепшаму раёну, загатпункту, калгасу, арганізацыйнай сыстэме, таварыству паляўнічых і асобным паляўнічым будзе выдана прэмія за лепшыя паказальнікі ўдарнай працы па выкананьні і перавыкананьні загатоўчага пляну па пушсырцы. Увесь матар'ял на сацспаборніцтве і ўдарніцтве трэба дасылаць футравай базе Пушнасындыкату і асьвятляць у друку.

Рабочыя і служачыя футравай базы ўпэўнены, што загатоўшчыкі і паляўнічыя прымуць усе захады да ажыцьцяўленьня вышэй паказаных задач і мабілізуюць сябе на выкананьне задач 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Па даручэньні агульнага сходу рабочых і служачых:
Ударная брыгада менскай футравай базы Пушнасындыкату.

Вышэй сьцяг рабочага шэфства

Пастанова ЦК КП(б)Б аб агляндзе стану рабочага шэфства над Чырвонай арміяй ярка таворыць аб тым, каб «у лютым месяцы правесьці шырокі агляд усёй шэфскай работы над часьцямі Чырвонай арміі пад пёзунгамі пашырэньня масавага рабочага шэфства, узмацненьня пралетарскага ўплыву на Чырвоную армію, шырокага газгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва паміж прадпрыемствамі і вайсковымі часьцямі».

Агляд пралетарскага шэфства—важнейшае зьвяно падрыхтоўкі да гадавіны. Гадавіну Чырвонай арміі трэба ўсямерна выкарыстаць для ўмацаваньня сувязі з фабрыкамі, заводамі, саветамі, прафсаюзамі, калгасьнікамі і МТО.

Трэба дабіцца дзейнасьці пралетарскага шэфства, трэба перабудаваць яго пад знакам новых задач.

І пастанова ЦК КП(б)Б гаворыць аб тым, што «рабочае шэфства над часьцямі Чырвонай арміі павінна быць падпарадкавана сучасным задачам сацыялістычнага будаўніцтва, баявой падрыхтоўцы чырвонаармейцаў і абароназдольнасьці СССР, праводзячы ўсе мерапрыемствы пры шырокім разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва».

Аднак, гэта кампанія не ахапіла шырокіх мас рабочых, не ператварылася ў важнейшую палітычную кампанію.

Нашы кіруючыя органы прыступілі да перагляду стану шэфства. ЦСПОВ ужо выпрацаваў новае прымацаваньне саюзаў і прадпрыемстваў да вайсковых часьцей, але саюзы, вайсковыя часьці, пралетарская грамадзкасьць ня ўцягнуты ў гэту справу.

На прадпрыемствах яшчэ пават шырока не разгорнута кампанія па падрыхтоўцы да 13 гадавіны Чырвонай арміі ў той час, як пастанова ЦК патрабуе «масавага плянавага наведваньня рабочымі чырвонаармейскіх часьцей і казарм, агульных сходаў рабочых і чырвонармейцаў і г. д.».

Да гадавіны РСЧА засталіся лічаныя дні. Трэба неадкладна пачаць рыхтавацца да правядзеньня 13 гадавіны Чырвонай арміі.

Гадавіна РСЧА павінна зноў і зноў мабілізаваць увагу ўсёй краіны вакол пытаньняў абароны. Трэба сёньня-ж пачаць падрыхтоўку пад знакам умацаваньня сувязі з Чырвонай арміяй, пад знакам умацаваньня абароназдольнасьці краіны.

Пастанова ЦК КП(б)Б павінна быць праведзена ў жыцьцё пры шырокім удзеле пралетарскай грамадзкасьці.

Х.

Агідны выпадак

У № 17 «Зьвязды» зьмяшчаўся артыкул аб дрэнным становішчы шэфскай работы на фабрыцы «Зьвязда», дзе работнікі гэтай фабрыкі ня ведаюць, над кім яны шэфствуюць.

Такое-ж становішча з шэфскай работай і наогул з ваенпай работай сярод рабочых існуе на фабрыцы «Маёвалакнабуд».

Вайсковыя гурткі на фабрыцы дрэнна працуюць, дэмабілізаваныя чырвонаармейцы не зьяўляюцца пачынальнікамі ў справе вялізацыі рабочых. Нізавы друк пытаньнямі вайсковай работы не займаецца.

У пастанове ЦК КП(б)Б мы чытаем: «Адзначаючы слабы ўдзел друку ў асьвятленьні рабочага шэфства над часьцямі Чырвонай арміі, прапанаваць цэнтральным, раённым і ўсім мясцовым газэтам рэгулярна і шырока асьвятляць гэтыя пытаньні».

Ня гледзячы на пакаянову работнікаў гарнізону, «Камунар Магілеўшчыны» адмовіўся надрукаваць пастанову ЦК пра масавы агляд шэфскай работы і ва апошні час газэта вельмі дрэнна друкуе матар'ял пра вайсковую работу, не канцэнтруючы ўвагі чытача на пытаньнях абароны краіны.

Чым вытлумачыць гэтае адмаўленьне, як не недацэнкай ваеннай небясьпекі.

Б. О.

Загадзя ўкамплектаваць калгасы цягавай сілай

ГАРАДОК, 10. (Па тэлеграфу). Учора ў сельсаветы ВЫЕХАЛІ 34 АДКАЗНЫЯ РАБОТНІКІ — партыйцы і камсамольцы, якія прабудуць у вёсцы ўвесь час падрыхтоўкі да сяўбы. Выехаўшыя работнікі будуць адначасова праводзіць двухдэкаднік штурму за пён.

Па калгасах пачалася распрацоўка дырэктывы Калгасцэнтру аб падрыхтоўцы каня да веснавой сяўбы. Некаторыя калгасы ўжо пачалі ажыцьцяўляць канкрэтныя мерапрыемствы, прадугледжаныя гэтымі дырэктывамі. Аднак, ужо зараз відавочна, што КАЛГАСАМ КОНЯЙ НЯ ХОПІЦЬ. Неабходна ўжыць рашучыя меры да сваячасовага забясьпячэньня раёну коньмі і кармамі.

НІКАНАЎ.

Пад знакам калгаснага прыліву

ЧЭЧАВІЦЫ. (Па тэлеграфу). ЗА ЧАС СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ Ў КАЛГАСАХ АРГАНІЗАВАНА 6 НОВЫХ КАЛЕКТЫВАЎ.

РАЙКАЛГАССЭКЦЫЯ.

Рамонт не разгорнут

У Чашніцкім раёне вельмі марудна разгортваецца рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару. Калгас Асташоўскага сельсавету даставіў плугі для рамонту ў кавальскую арцель у Чашніках. Плугі ўжо ляжаць там больш за месяц, але рамонт іх яшчэ не пачаты. У апошнія дні прывезьлі для рамонту плугі калгасу Лазукоўскага сельсавету, але і яны не рамантуюцца.

Да вёсак і паасобных двароў пляны веснавой сяўбы не даведзены.

СЬНЕГАВЫ.

2-гі пленум ЦК МОПР'у БССР

Прэзыдыум ЦК МОПР'у БССР пастанавіў склікаць 2-гі пленум ЦК 5-га сакавіка. Апрача ўсіх членаў і кандыдатаў ЦК, запрашаюцца старшыні або сакратары ўсіх пагранічных раёнаў і ўпаўнаважаныя мопрарганізацый пагранчасьцей.

У парадку дня пленуму стаіць пытаньні аб выніках трэцяга ўсебеларускага зьезду МОПР'у, вынікі кампаніі зімовай дапамогі і задачы МОПР'у на веснавы і летні перыяд.

РАЁНЫ ЎКЛЮЧАЮЦЦА Ў ШТУРМ ЗА ЛЁН

Аршанскі раённы зьезд саветаў абавязаўся ліквідаваць прарывы ў ільназагатоўках да X Усебеларускага зьезду саветаў

Мабілізаваць усе сілы партарганізацый на барацьбу з праваапартуністычнай практыкай— асноўнай прычынай прарыву

Віцебшчына пачынае штурм

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу). Створаны штаб для правядзеньня штурму ліквідацыі прарываў у ільназагатоўках. Арганізавана 18 брыгад у складзе 80 чал. партыйнага і прафсаюзнага актыву, якія выяжджаюць у сельсаветы.

Штаб—ЗЭНЗЭЛЬ, БРАЙНІН.

***

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.). Ільназагатоўкі на Віцебскім раёне да самых апошніх дзён праходзілі недапушчальна дрэнна. Партыйная арганізацыя і грамадзкасьць раёну ня была мабілізавана на выкананьне плянавых заданьняў. Адначасны апартуністычныя настрої з боку асобных партыйцаў якія яўна недацэньваюць вялізарнага значэньня неадкладнага выкананьня пляну ільназагатовак. Так, адзін з адказных працаўнікоў райкаапсаюзу запрапанаваў, каб ільназагатоўкі... адкласьці да вясны, пакіраваўшы зараз усю увагу на выкананьне іншых больш важных, на яго думцы, задач.

Зарэгістраваны таксама і факты перагібаў. Так, у Селюцкім сельсавеце далі цьвёрдае заданьне бедняку. У Шумянскім сельсавеце цьвёрдыя заданьні даведзены да сераднякоў.

Віцебскі РВК прыміраўча адносіцца да тых сельсаветаў, якія асабліва моцна адстаюць і дае кулацка-заможным гаспадаркі яшчэ ільну не здалі.

На 5-га лютага раён выканаў заданьне па ільнавалакну на 22,4 проц., а па ільнасемі—на 55,6 проц. Гэтыя лічбы сыгналізуюць аб недапушчальных прарывах, якія ў асноўным тлумачацца немабілізацыяй мас калгасьнікаў і адналасобнікаў беднякоў і сераднякоў на поўнае і сваячасовае выкананьне пляну ільназагатовак, апартуністычнай практыкай раду мясцовых арганізацый і работнікаў.

О. Ш.

Случчына ўсё яшчэ цягнецца ў хвасьце

СЛУЦАК (Па тэлеф. наш. кар.). Зруху ў выкананьні пляну ільназагатовак раёнам не дасягнута. План выканан—па ільнавалакну—на 24 проц., па ільнанасеньні—на 52 проц.

Такое становішча тлумачыцца праваапартуністычнай практыкай сельсаветаў і раду мясцовых арганізацый, якія, спадзяючыся на самацёк, не арганізуюць мас, ні прымаюць належных крокаў у адносінах да кулака.

У Стара-гольскім сельсавеце кулакі катэгарычна адмовіліся ад здачы ільну, між тым да злосных нядатчыкаў ужываюцца вельмі слабыя меры ўзьдзейнасьці.

Зусім у хвасьце цягнецца Казпоўскі і Амгавіцкі сельсаветы.

Некаторыя сельсаветы зусім не прадстаўляюць вестак аб ходзе ільназагатовак.

Задачы 2-хтыднёвіка штурму не папулярызаваны.

Хаўкін.

Брыгадзіры Шклоўшчыны абвясьцілі сябе ўдарнікамі па арганізацыі чырвоных ільняных абозаў

ШКЛОЎ, 11. (Па тэлефону). Шклоўскі райком партыі мабілізаваў 18 чалавек для работы ў сельсаветах па ільназагатоўках. Праведзена нарада старшынь сельсаветаў, РКК-РСІ, РК КП(б)Б і райпрафсавет пасылаюць для правядзеньня кампаніі ільназагатовак 60 прапагандыстаў.

Райгазэта «Прамень камунізму» паключыла дагавор з брыгадзірамі, якія ад'яжджаюць у сельсаветы, каб увесь ход двухдэкадніка штурму па выкананьні пляну ільназагатовак асьвятляць на старонках газэты і рашуча змагацца за кожнае кілё ільну.

Брыгадзіры абвясьцілі сябе ўдарнікамі па арганізацыі чырвоных абозаў імя «X зьезду саветаў БССР».

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, праверка ходу падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі, складаньне пасеўных фондаў, аўчыстка і рамонт с.-г. машын—увязваецца з арганізацыяй новага калгаснага прыліву.

Брыгадзір НОВІКАЎ.

Аршанскі зьезд саветаў мабілізаваў сябе на ліквідацыю прарываў

ВОРША. (Па тэлеграфу). Аршанскі раён уключыўся ў двухдэкаднік штурму на ліквідацыі прарываў у выкананьні ільназагатоўчага пляну.

Раённы зьезд саветаў, які скончыў сваю работу, абвясьціў сябе мабілізаваным на ліквідацыю прарыву ў ільназагатоўках да ўсебеларускага зьезду саветаў.

На 1 лютага па раёне план загатовак ільнавалакна выканан на 23,9 проц., ільнасемя—на 79,9 проц., пянькі—на 0,33 проц.

Райком партыі для ліквідацыі прарыву паслаў на 2 тыдні ў сельсаветы 15 камуністаў, РК ЛКСМБ—20 камсамольцаў, райпрафсавет—10 адказных работнікаў.

Райгазэта «Ленінскі заклік» на прыкладзе «Зьвязды» арганізуе заочны мітынг-перакліч сельсаветаў на лепшае выкананьне пляну загатовак ільну.

Шырока папулярызуюцца ільготы здатчыкам. Пракуратуры, суду і міліцыі прапанавана прыняць тэрміновыя меры па разгляде спраў у адносінах кулацкіх двароў, якія ня выконваюць сваіх заданьняў.

У вёскі паслана 30 прапагандыстаў для папулярызацыі адозвы партыі і ўраду аб кантрактацыі.

Кустановіч.

ПАДПІШЫСЯ НА ЧАСОПІС ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
1 м.—25 к., 3 м.—75 к., 6 м.—1 р. 50 к., на год—2 р. 75 к.

Правыя апартуністы Капыльшчыны зрываюць ільназагатоўкі

КАПЫЛЬ, 12. (Па тэлефону). Кампанія ільназагатовак па Капыльскім раёне праходзіць вельмі дрэнна.

Да 10 лютага план загатовак па раёне выканан усяго на 13,6 проц. Асноўная прычына невыкананьня—давядзеньне цьвёрдага заданьня да кулацка-заможных двароў пачалося з 20 студзеня.

Па большасьці сельсаветаў па кулацкія двары пакладзена ад 2 да 5 кілёграм ільнавалакна.

Капыльскі местачковы сельсавет на 20 заможных гаспадарак налажыў 18 кілёграм ільнавалакна, у той час, як бяднацка-серадняцкія гаспадаркі здаюць па 8-12 кілёграм.

На 670 кулацка-заможных гаспадарак раёну пакладзена ўсяго 94 цэнтнэры (384 пуд.) ільнавалакна, што ў адносінах да агульнага пляновага заданьня па раёне складае мізэрны процант.

Вакол загатовак не мабілізаваны масы калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў.

Сяляне вёскі Чорнагубава арганізавалі чырвоны абоз па здачы ільнавалакна і завезьлі яго ў краму Белдзяржгандлю.

Калі здатчыкі прышлі ў сваю вяскоую краму атрымаць прэміі ім спакойна адказалі:

— Лён здалі Белдзяржгандлю, няхай ён вас і прэміруе.

На дрэнную працу сельсавету ніхто не рэагуе. Уся работа праходзіць самацёкам.

Упаўнаважаныя РВК, якія працавалі на мясцох нічога не зрабілі. Калгасы ня выканалі сваіх заданьняў, а райкалгассаюз і райкаапсаюз ніякіх мер ня прымаюць.

Сельсаветы да гэтага часу ня маюць вучоту колькі яны здалі ільнавалакна і колькі яшчэ засталося здаць. Раённыя загатоўчыя арганізацыі таксама ня маюць ніякага вучоту.

Партыйныя ячэйкі і сельсаветы не разгарнулі штурму.

За поўную бязьдзейнасьць у рабоце, райком партыі зьняў з працы старшыню райкалгассаюзу Газава і інш.

Трэба напесьці руйнуючы ўдар па правых апартуністах, якія зрываюць пляны загатовак ільнавалакна, больш націскуць на кулака і прымусіць яго ў тэрмін выканаць цьвёрдыя заданьні.

Мабілізаваць масы беднаты, сераднякоў і калгасьнікаў на баявое выкананьне ільназагатоўчых плянаў — неадкладная задача Капыльскай партыйнай арганізацыі.

Брыгада «Зьвязды».

КЛЮЙКО, ФРЫД.

„У нашым сельсавеце кулакі ільну ня маюць"

ЛЕПЕЛЬ, 12. (Па тэлефону). План загатовак ільну на 5 лютага па Лепельскім раёне выканан на 23 проц. З боку паасобных работнікаў паглядзяючы факты махровай праваапартуністычнай практыкі

Па Савецкай Беларусі

Пастанова ЦВК і СНК БССР

аб забароне абкладаць сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку з прычыны ўліку заработку ад загатоўкі і вывазкі лесу і каменьня

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЮЦЬ устанавіць, што заработак ад загатоўкі і вывазкі лесу і каменьня не можа служыць, пры адсутнасьці іншых адзнак, падставай для абкладаньня гаспадараў сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку і для дачы цьвёрдых заданьняў гэтым гаспадаркам.

СТАРШЫНЯ ЦВК БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.
НАМ. СТАРШЫНІ СНК БССР
К. БЭНЭК.
САКРАТАР ЦВК БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

На раённых зьездах саветаў

ЛАГОЙСК. (Наш кар.). Калгаснікі, беднякі і сераднякі Лагойшчыны арганізавалі дыярыюшныя абозы ў падарунак раённаму зьезду саветаў. За час работы зьезду абозамі здана дзяржаве 300 цэнтн. збожжа, 25 сьвіней, 65 штук буйной рагатай жывёлы, 60 авец і інш.

У Юркавіцкім сельсавеце арганізован калгас імя 6-га раённага зьезду саветаў.

***

РЭЧЫЦА. 3-ці зьезд саветаў Рэчыцкага раёну шле шчырае прывітаньне штабу сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР—ЦК КП(б)Б і яго цэнтральнаму органу—«Зьвязьдзе». Зьезд запэўнівае, што пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе бальшавіцкага ЦК пры штодзённай дапамоге баявога рупару партыі газэты «Зьвязда» рабочыя, калгаснікі, беднякі і серадняки—алнасобнікі Рэчыцкага раёну з посьпехам выканаюць заданьні трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Вядучы рашучую барацьбу з ухілам ад ленінскай лініі партыі, з апартуністамі розных колераў, мы дабіемся поўнага выкананьня вызначаных плянаў як на прамысловасьці, так і па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Нахай жыве КП(б)Б і яе ЦО—«Зьвязда»!

***

У рэдакцыю паступілі прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), тав. Сталіну, ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР і «Зьвязде» ад зьездаў саветаў Горацкага, Рагачоўскага, Койданаўскага, Рэчыцкага, Клімавіцкага, Мазырскага, Дуброўенскага і Пятрыкоўскага раёнаў.

Абнавіць апарат Барысаўскай пошты

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Бюракратызм, боязасьць і чыноўніцкія адносіны пануюць сярод пасасобных работнікаў БАРЫСАЎСКАГА ПАШТОВАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ.

Прафарганізацыя, парт'ячэйка бязьдзейнічаюць. Палітычна-культурная работа не праводзіцца. Насьценгазэта ня выходзіць. Сацспаборніцтва і ударнічэтва — без кіраўніцтва. Таму сацдагаворы ня выконваюцца, ударныя брыгады развальваюцца, зьяўляюцца ілжэ-ударнікі.

Былі выпадкі праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму. Так, супрацоўнік Ляўчук ігнаруе беларускую мову і чіпсіі не ня ўжывае. На сёмінні дзень гэты махровы вялікадзяржаўны шавініст застаўся на рабоце бяз усякіх спагнаньняў, а грамадзкасьць пошты не мабілізавана вакол такіх праяўленьняў вялікадзяржаўнага шавінізму.

Мы пічым, што апарат барысаўскай пошты павінен быць абноўлен.

Л—ны.

Смалявіцкае спажыўтаварыства парушае грашовы зварот

Сетка крам Смалявіцкага раённага спажывецкага таварыства раскінута па вялікім радыусе ад раённага цэнтру і таму загадчыкі крам ня могуць здаваць штодзённую выручку. Грошы ў крамах ляжаць па некалькі дзён мёртвым капіталам.

Між тым, гэту ненармальнасьць можна лёгка ліквідаваць шляхам здачы грошай у ашчадкасы. Спажывецкае таварыства чамусьці не практыкуе такі метад і гэтым самым парушае нармальны грашовы зварот.

Селькор Ім.

Максымальна эканоміць апал

На пасяджэньні СНК БССР быў заслуханы даклад ВСНГБ аб эканоміі апалу. СНК прапанаваў ВСНГ, Наркамгандлю і НК Земляробства неадкладна ўстанавіць фактычныя выдаткі апалу на адзінку прадукцыі па ўсіх прадпрыемствах у 1930 г. і не пазьней 15-га лютага вызначыць цьвёрдыя нормы выдаткаў апалу на 1931 г.

У зьвязку з неабходнасьцю скарачэньня спажываньня ў першым кварталі 1931 г. вугалю на 15 проц. і нафтавога апалу на 25 проц., СНК лічыць неабходным зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне намечанага пляну пераводу прадпрыемстваў на мясцовы апал (торф, дровы) і на прыстасаваньне такіх спосабаў апалу торфам і дровамі, якія-б забясьпечылі максымальную іх эканомію. СНК адзначыў, што да гэтага часу нездавальняюча праводзілася прэміяваньне за эканомію апалу. ВСНГ, Наркамгандлю і НКЗ даручана неадкладна распрацаваць інструкцыі аб парадку і мэтадах прэміяваньня за эканомію апалу для кожнай галіны прамысловасьці.

Там, дзе ня рыхтуюцца да будаўнічага сэзону

Сёгэтаг САСНОЎКА, Віцебскага раёну, ЗУСІМ НЯ РЫХТУЕЦЦА ДА БУДАЎНІЧАГА СЭЗОНУ.

Увесну саўгас павінен пабудаваць інтэрнат для рабочых, памяшканьні для мышёпы і птушак, хавалькі для садавіны і гародніны і інш.

Адкан, ні адміністрацыя, ні Галоўсацстрах (саўгас належыць апошняму) нічога не робяць для падрыхтоўкі будаўніцтва.

На сёньнішні дзень у саўгасе няма ні аднаго бервяна, няма цэглы, жалеза, цьвікоў. Яшчэ не гатовы пляны пабудоў, тэхнічнае кіраўніцтва адсутнічае. На гледзячы на пастановы ўрадавых органаў аб падрыхтоўцы будаўнічых матэрыялаў у зімовы час, кіраўніцтва саўгасу яшчэ не здало нарадаў на будаўнічыя матэрыялы.

Галоўсацстрах павінен безадкладна рэагаваць на гэта становішча і не дапусьціць зрыву будаўніцтва.

ХАРЫТОВІЧ.

Арганізаваць прыёмачны пункт

Азарыцкі раймалжывёласаюз знаходзіцца на вялікай адлегласьці ад прыёмачных пунктаў Белмяса. Адпраўка жывёлы да прыёмачных пунктаў цягнецца 5 дзён. У выніку гэтага жывёла худзее, выдаткі вялікія, агенты марнуюць часткоўны час загатовак.

Аб гэтым ня раз Азарыцкі малжывёласаюз даводзіў да ведама Белмяса, але ўсе гэтыя заявы засталіся бяз увагі, і прыёмачны пункт у Азарыцкім раёне і на сёньнішні дзень яшчэ не адкрыт. Між тым патрэба ў ім вялікая.

Шульман.

Добры прыклад Дрысенскага РВК

ДРЫСА. (Наш кар.). Нядаўна на пасяджэньні прэзыдыуму Дрысенскага РВК, які адбыўся ў Каркалецкім сельсавеце, былі заслуханы даклады сельсавету і калгасу «Гігант». На пасяджэньні прысутнічала каля 300 калгаснікаў і адпаасобнікі. Па дакладах разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. У часе работы прэзыдыуму ў сельсавеце арганізован новы калгас імя Барашылава.

Калгаснікі, беднякі і серадняки выказалі пажаданьне, каб пасяджэньні прэзыдыуму РВК часьцей наладжваліся непасрэдна на мясцох.

Няма кантролю над ажыцьцяўленьнем вызначаных плянаў

Спадзяваньне па самацёк усё яшчэ панае ў БАБРУЙСКІМ РАЁНЕ ў справе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Пляны даўно складзены і пакіраваны ў сельсаветы, але як яны ажыцьцяўляюцца—аб гэтым у раённых установах нічога ня ведаюць. Няма і дакладных вестак аб зборы насенных фондаў і ачыстцы насеньня. У радзе калгасаў яшчэ ня скончан абмалот.

Плян загатовак выкапан па капыцкіх у разьмеры 2,8 проц., цімафееўцы—2 проц., сэрадэлі—3 проц. і лубіне... 0,1 проц.

Ня лепш справа і з рамонтам інвэнтару. Калгасэкцыя не мабілізавала ўвагі калгасаў на своечасовым рамонце. У выніку ні адзін з калгасаў пакуль што не вязе машын для рамонту.

З усяго паданага можна зрабіць толькі адзін вывад—раённыя арганізацыі яшчэ не пераключыліся на баявыя тэмпы падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і не мабілізавалі ва-ся гэтай справы вясковага актыву. Перавыбарчая кампанія ў калгасах не спарыстоўваецца для арганізацыі новага калгаснага прыліву.

Да міжнароднага дня тэатру

15 лютага—міжнародны дзень тэатру. Да гэтага дня па усіх тэатрах БССР будуць праведзены даклады аб стаўленьні рабочага тэатру ў капіталістычных краінах і ў Савецкім Саюзе. Для ванямленьня працоўнага насельніцтва в метамі гэтага дня вызначан камітэт садзейнасьці.

Пастаўлена пытаньне аб правядзеньні спэцыяльнай падпіскі, аб зборы сродкаў у фонд міжнароднага рабочага тэатру.

Для кіраўніцтва ўсёй работай па лініі ЦСПСБ складзен грамадзкі камітэт.

Кулакам не даюць адпору

САМАХВАЛАВІЧЫ. (Наш кар.). Барацьба са зьвышчэньнем жывёлы ў раёне зусім не вядзецца. У вёсцы Цяплень і наогул у Цяплевскім сельсавеце кулакі і падкулачнікі рэжуць жывёлу бяз усякай бязьні.

Сельсавет, на вачох якога ўсё гэта робіцца, ня прымае ніякіх мер. Патрэбны рашучыя меры для спыненьня драпежніцкага забою жывёлы.

ВЕДАЮЧЫ.

Бровар саўгасу „Пагост" пад пагрозай спыненьня

Бровар саўгасу «ПАГОСТ» (Старобінскі раён) вельмі дрэнна забясьпечваецца сырцом. Зараз з-за галавацінства Саюзхлеба бровар АПЫНУЎСЯ ПАД ПАГРОЗАЙ СПЫНЕНЬНЯ. Усё збожжа з саўгасу вывезена ў спуцкае аддзяленьне Саюзхлеба, а бровару выдалі нарад на атрыманьне збожжа ў Спуцку. Такая «распрадчасьць» спуцкага аддзяленьня Саюзхлеба прывяла да павялічэньня сабекошту і да пагрозы спыненьня бровару. Везьці збожжа зараз назад са Спуцку няма ніякай магчымасьці, з прычыны перагружанасьці цягавай сілы саўгасу.

Спуцкае аддзяленьне павінна прыняць тэрміновыя захады, каб забясьпечыць бровар патрэбным сырцом.

Калгаснік.

Нам пішуць

Узмацніць загатоўку лёду

Каля месяцу прайшло ад пачатку кампаніі загатовак лёду для малочнай прамысловасьці. Між тым дагэтуль яшчэ ні адно райспажыўтаварыства не прыступіла да загатовак. Такія нядбайныя адносіны да загатоўкі лёду мелі месца і ў мінулым годзе, у выніку чаго пагоршылася якасьць малочных прадуктаў, асабліва масла.

У БССР ёсьць 636 масла-сыраводаў і каля 2 тыс. сэпаратарскіх пунктаў. Неабходна зараз-жа прыняць усе захады да забясьпечэньня лёдам усіх гэтых заводаў і пунктаў.

Вінаватых—да адказнасьці

Пры Гомельскай пасажырскай станцыі арганізаваліся курсы па падрыхтоўцы змазчыкаў і качагараў. У часе набору курсантаў мэдагляду ня было. Пасьля месячнага навучаньня аказалася, што рад курсантаў па сваім здароўі не падыходзіць для гэтых кваліфікацый. Апошнія пакінулі наведваньне курсаў. Сродкі на ўтрыманьне гэтых курсантаў страчаны бяз усякай карысьці. Вінаватыя ў гэтым павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Ляшук.
Левін.

Тэхнікум сьвінагадоўлі—без сродкаў

У верасьні 1930 г. загадчык Чачэрскай школы 2 ступені атрымаў выпіску з пратаколу СНК аб тым, што 8 і 9 групы рэарганізуюцца ў прафшколу сьвінагадоўлі, а з 1 студзеня 1931 г.—у тэхнікум. Загадчыку было прапанавана ўкамплектаваць 50 вучнямі першыя курсы школы, што і было зроблена.

Усё было-б добра, але... ні Наркамвем, ні трэст «Сьвінавод» ня ўключылі ў кашторыс утрыманьне тэхнікуму. Тэхнікум, такім чынам, застаўся вусім бяз сродкаў. Большасьць студэнтаў пакінула ўжо наведваньне тэхнікуму. Ствараецца рэальная пагроза зрыву навучальнага пляну.

Адпаведныя арганізацыі павінны ўрэгуляваць гэтае пытаньне і стварыць тэхнікуму неабходныя ўмовы для нармальнай работы.

П.

Райсавет Асоавіяхіму бязьдзейнічае

Лёзьненскі райсавет Асоавіяхіму бязьдзейнічае. Вазнізацыя працоўнага насельніцтва—у занядбаньне. Ніхто гэтай справай не займаецца. РК КП(б)Б ня прымае рэальных мер для палепшэньня работы раённай арганізацыі Асоавіяхіму.

Кавель
Капірын.

2-гі УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД АСОАВІЯХІМУ

Дзеньнік зьезду

На вячэрнім пасяджэньні 11-га лютага зьезд заслухаў даклады: тав. ПЯТРОВА — аб рабоце вясковага сэктару ЦС; тав. ДУБАВІЦКАГА — аб рабоце сэктару паветрана-хэмічнай абароны і тав. МАКСІМЕНКА — аб становішчы авіяцыйнай справы.

У спрэчках выступіла 18 дэлегатаў. Дэлегаты адзначылі, што ня ўсе саюзныя арганізацыі БССР выконваюць свае абавязкі па дапамозе ў рабоце Асоавіяхіму. Рад савецкіх органаў не павярнуўся яшчэ тварам да ўзмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны, да паляпшэньня вайсковай работы сярод насельніцтва. Пасобныя арганізацыі Асоавіяхіму не пераключылі сваёй работы ў адпаведнасьці з запатрабаваньнямі сучаснага пэрыяду. Многія ячэйкі зусім ня спрыяюць правядзеньню гаспадарча-палітычных кампаній.

Бурныя воплескамі зьезд спаткаў 65-гадовага дэлегата-калгасьніка з Рэчыцкага р-ну т. ЯНДОЎСКАГА. У сваёй прамове тав. Яндоўскі зьвярнуў увагу зьезду на неабходнасьць паляпшэньня вайсковай справы сярод моладзі.

Тав. ДЫГУН падкрэсьліў неабходнасьць рашучай барацьбы ў арганізацыях Асоавіяхіму з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, контр-рэвалюцыйнага нац-дэмакратызму і з шавінізмамі ўсіх колераў, за генэральную лінію партыі, за ленінскую нацпалітыку.

Зьезд вітаў дэлегацыі ад рабочых заводу «КАМУНАР» і менскіх піянэр-атрадаў. На імя зьезду атрымана шмат прывітальных тэлеграм ад рабочых заводаў і фабрык БССР. У сваёй прывітальнай тэлеграме РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА паведамілі зьезду, што імі сабрана 500 руб. на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў». РАБОЧЫЯ ПАЛЕСДРУКУ сабралі ў фонд абароны краіны — 803 руб. І ў фонд савецкага дырыжаблябудаўніцтва — 600 руб. У адзнаку 50-годзьдзя Кліменція Яфрэмавіча Варашылава РАБОЧЫЯ ПАЛЕСДРУКУ стварылі ўдарныя брыгады імя тав. Варашылава. Сумесна з падшэфнай часьцю РСЧА быў арганізован суботнік, на якім надрукавана «памятка чырвонаармейцам».

Аналёгічныя тэлеграмы атрыманы ад рабочых заводу «Пралетарыі» і ф-к «Праца» і «Камінтэрн» (Гомель).

***

Раніцняе пасяджэньне 12-га лютага было прысьвечана працягу спрэчак. Тав. ВАСІЛЕВІЧ (АБВШ) у сваёй прамове паказаў на неабходнасьць прыцягненьня камскладу РСЧА да актыўнага ўдзелу ў рабоце Асоавіяхіму.

Тав. ВАСЬКОВІЧ (ЦК КП(б)Б) зьвярнуў увагу зьезду на неабходнасьць падрыхтоўкі насельніцтва да паветрана-хэмічнай абароны. Тав. Васьковіч адзначыў таксама, што друк наш мала асьвятляе пытаньні вялізацыі.

З заключнымі прамовамі выступілі нам. старшыні Цэнтральнага савету Асоавіяхіму БССР тав. ДРЫЛЕНАК, і генэральны сакратар ЦС Асоавіяхіму СССР тав. МАЛІНОЎСКІ. НА РАНІШНІМ-ЖА ПАСЯДЖЭНЬНІ З ВЯЛІКАЙ ПРАМОВАЙ ВЫСТУПІЎ САКРАТАР ЦК КП(б)Б тав. ШАРАНГОВІЧ.

***

На аснове хадайніцтва раду арганізацый т. т. ГАЛАДЗЕД І ВАСЬКОВІЧ узнагароджаны зьездам «значком актывіста». Зьезд пастанавіў хадайнічаць таксама перад Асоавіяхімам СССР аб узнагародзе «значком актывіста» тав. Маліноўскага за актыўную дзейнасьць.

Справа злачынцаў з МЦРК і сабе, і сваяком...

На працягу некалькіх даён Вярхоўны суд рэспублікі разглядаў справу шкодніка-злачынцаў з МЦРК.

На лаве падсудных — аматары дэфіцытных тавараў, работнікі прадуктовых і галянтарэйных крам і ларкоў.

Іх 15: Саламянскі, Грынглаз, Шарф, Жукоўская, Крэйндэль і інш. Усе яны абвінавачваюцца ў сыстэматычных крадзяжох.

Крымінальны вышук устанавіў, што некаторыя з абвінавачаных мелі ў кватэры па тры новыя коўдры (Грынглаз), па 9 пар панчох (Жукоўская), каву, галяндзкі сыр і г. д.

У галоўнага абвінавачанага — Саламянскага — выкрылі 21 кавалак туалетнага мылу, 49 мэтраў мадэналяму, палатно, пшанічную муку, рыс і манную крупу.

Памянёныя «работнікі» гандлявалі дэфіцытнымі таварамі, перадавалі іх сваім прыяцелям і сваяком.

Па справе выклікана каля 50 сьведак.

Учора падсудным было дана апошняе слова.

Прыгавар

10-га лютага позна вечарам Вярхоўны суд БССР вынес прыгавар:

САЛАМЯНСКІ І КУШНЭР прыгавораны да 7 год пазбаўленьня волі з высылкай у адлеглыя мясцовасьці СССР тэрмінам на 5 год пасьля адбыцьця пакараньня тэрмінам на 2 гады; КУШНЭР Ф. — да 3 год пазбаўленьня волі; КРЭЙНДЭЛЬ — да 3 год пазбаўленьня волі з забаронай працаваць у казэнных арганізацыях на працягу 3 год; ХОДАШ і ШУМАХЭР — да 3 год пазбаўленьня волі кожная.

Прымаючы пад увагу, што як Ходаш, так і Шумахэр прызналі поўчасьцю сваю віну, суд знайшоў магчымым зьменшыць ім тэрмін пазбаўленьня волі да аднаго году, пічучы яго ўмоўным на працягу трох год.

ШЫМАНОЎСКІ І МАЛЫШАЎ прыгавораны да аднаго году пазбаўленьня волі кожны.

Прымаючы пад увагу хваравітае становішча Шыманоўскага, суд знайшоў магчымым пічыць прыгавор у адносінах да яго ўмоўным на працягу трох год.

Рэшта падсудных апраўдана.

„Многа не разважаць"

14-га студзеня грамадзянка Шалешка атрымала ад доктара Пярасьвенскай амбулаторыі тав. Кургіна дазвол на выдачу з ЦРК некаторых прадуктаў для хворага дзіцяці. Калі-ж Шалешка зьвярнулася ў аддзел разьмеркаваньня МЦРК ёй прапанавалі прысьці праз тры дні — 17-га студзеня і адаць толькі рацэпт, а 21-га студзеня абяцалі даць адказ.

Ня гледзячы на ўсе пратэсты і заявы з боку Шалешкі, што 21-га прадукты ёй магчыма і ня будуць патрэбны, а зараз яны тэрмінова неабходны, бюракраты з аддзелу разьмеркаваньня паралі ёй «многа не разважаць», бо «наш парадак для вас мяняць ня будзем».

Ш.

Глушыцель самакрытыкі атрымаў па заслугах

Камісія па чыстцы апарату Белрыбы выкрыла рад недахопаў. Пасобныя работнікі супрацьліўляліся разгортваньню крытыкі і самакрытыкі. Старшыня мясцкому тав. Фэльдман ня толькі на спрыяў разгортваньню самакрытыкі, але сам глушыў яе. Будучы старшынём рэдкалегіі насьценгазэты, Фэльдман не працускаў допісаў, у якіх закраналіся недахопы работы мясцкому, апарату і, у прыватнасьці, яго ўласныя памылкі.

Праверачная камісія прыняла рад мер для паляпшэньня работы апарату Белрыбы. Тав. Фэльдман асабістэн ад абавязкаў старшыні мясцкому, рэдактара газэты і выведзен са складу бюро ячэйкі КП(б)Б

Н.

За дзень

Культсэктар ЦСПСБ у бліжэйшы час склікае нараду прафактыву, загадчыкаў клюбаў і чырвоных куткоў і радыё-аматараў па пытаньні аб рабоце Белрадыёцэнтру.

— Адказным рэдактарам газэты Белрадыёцэнтру назначаны тав. Клімковіч.

— У канцы сакавіка ў Менску склікаецца ўсебеларускі зьезд бібліятэчных работнікаў. У рабоце зьезду прымуць удзел 50 лепшых ударнікаў бібліятэчнае работы і 10 чытачоў. Зьезд выбярэ дэлегатаў на ўсесаюзны зьезд бібліятэчных работнікаў.

— ЦСПСБ камандыруе ў раёны БССР спэцыяльныя брыгады прафработнікаў і курсантаў школы прафруху для дапамогі мясцовым арганізацыям у перабудове культработы.

— З 5 па 25 лютага ў БССР будзе праводзіцца агляд шэфства рабочых над часьцямі Чырвонай армії. Пры ўсіх прафарганізацыях для правядзеньня агляду складаюцца спэцыяльныя камісіі.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ У ПАСЁЛКУ «ХЛЕБНІК»

Вельмі дрэнна пабудаваны пасёлак «Хлебнік» ЖАКТу «Чырвоны Кастрычнік», (2-я Сярпухоўская вуліца).

Дом складаецца з 3-х кватэр і толькі адна з іх—з паравым апаленьнем. Паравыя трубы трэснулі і не паддаюцца рамонту. Кватэру займае рабочы 1-й друкарні тав. Ланштэйн. Ужо звыш трох месяцаў як гэта кватэра не апальваецца. Сям'я тав. Ланштэйна мерзьне.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у безгаспадарчым будаўніцтве.

ВЕДАЮЧЫ.

ПАДПІШЫСЯ
НА ЧАСОПІСЬ
БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ
ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:
на 1 м.—35 к., на 3 м.—1 р. 05 к., на 6 м.—2 р. 10 к., на год—4 р. 20 к.

У Гомелі арганізавана транспартнае спажывецкае таварыства

У Гомелі скончана арганізацыя транспартнага спажывецкага таварыства. Апошняе будзе абслугоўваць каля 10.000 чыгуначнікаў Гомельскага вузла. З арганізацыяй самастойнай транспартнай каапэрацыі, забесьпячэньне чыгуначнікаў павінна палепшыцца. Лік крам на вузьле ўжо павялічыўся з 4 да 6. На вузьле 5 сталовых, культурная чайная. Арганізавана дзіцячая сталоўка на 3.000 абедаў. Пры клюбе чыгуначнікаў на ст. Гомель абсталявана сталоўка на 4.000 абедаў. Арганізавана кухня-разьмеркавальнік. Палепшылася і якасьць абедаў.

120 абедаў на... 600 рабочых

Гомельскі ЦРК да гэтага часу не палепшыў пастаноўку грамадзкага харчаваньня нават на такіх буйных прадпрыемствах, як «Палесдрук» і фабрыка «Камінтэрн». Абеды, якія даставляюцца ў тэрмосах з разьмеркавальніку, зусім дрэннай якасьці. Памяшканьні сталовай на фабрыцы «Камінтэрн» і «Палесдрук» не адпавядаюць свайму прызначэньню, КАБ ПАСЬПЕЦЬ ПААБЕДАЦЬ РАБОЧЫЯ ФАБРЫКІ «КАМІНТЭРН» КІДАЮЦЬ РАБОТУ ЗА 10-15 ХВІЛІН ДА ГУДКА. Зусім дрэнна абслугоўваюцца гарачай стравай другая і трэцяя зьмены. Гэтымі днямі для 600 рабочых фабрыкі разьмеркавальнікам было адпушчана ўсяго 120 абедаў.

Мясцовыя арганізацыі павінны безадкладна ўзяцца за паляпшэньне грамадзкага харчаваньня. Трэба праверыць работу разьмеркавальніка. Аддзел грамадзкага харчаваньня ЦРК павінен павярнуцца тварам да заводу.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ.

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз. — групавая кансультацыя для ваючнікаў Камвузу, СПШ, а таксама т. т., што займаюцца самаадукацыяй па матэматыцы і эканомгеаграфіі.

— **Клюб саматужнікаў.** У 19 гадз.— вечар для саматужнікаў адзіночак. Даклад — «3-ці рашаючы год пяцігодкі і задачы па мабілізацыі сродкаў». Пасьля —канцэрт.

Нав.-тэхн. т-ва. У 19 г. у буд. ХТІ—пасяджэньне навукова-тэхнічнага таварыства тарфянога сэктару НДІ прам., на якім будуць заслуханы даклады: інж. Цыпяровіча — «Аб пабудове газагенэратару», і т. Біннеускага — «Аб усадцы тарфяніку». Уваход вольны.

ЗАЎТРА:

— **Дом Камасьветы.** У 19 гадз., пакой № 6 (уваход з вул. К. Маркса) — групавая кансультацыя для газэтных работнікаў на тэму: «Нізавы друк у барацьбе за транспарт». На кансультацыю павінны зьявіцца члены рэдкалегіі насьценгазэт і шматтыражак і рабкоры.

— **Пушкінская бібліятэка.** У 20 з пал. гадз., у пам. біб-кі імя Пушкіна (Кастрычніцкая, 5) — чарговыя заняткі бібліятэкіяў на павышэньні сваёй кваліфікацыі. Тэма: распрацоўка матар'ялаў Усерасійскай канфэрэнцыі па дзіцячай кнізе. Дакл. т. т. Баль і Гародкіна. Яўка бібліятэкараў абавязкова без спазьненьня. Запрашаюцца бібліятэкары прафсаюзных і школьных бібліятэк і чытачы.

— 14 лютага ў 6 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу шчаўіцкай фабрыкі (вуліца Калінаўскага), рэдакцыя «Калгаснік Беларусі» (б. «Бел. Вёска») склікае пашыраную нараду на загатоўцы шчаціны і конволасу. На нараду запрашаюцца адказныя прадстаўнікі: Белкаапсаюзу, Белмалжывёласаюзу, Саюзскурп, Белмяса, боўні, Калгаспэнтру, Сьвінаводтрэсту, Наркамгандлю, ЦП саюзу гарбароў, прыгаралны райкаапсаюз і раённае спажывецкае таварыства, прадстаўнікі шчаціннай і шчотачнай фабрык (пажадана прысутнасьць рабочых - ударнікаў, усе брыгадзіры, якія выяжджалі на работы па загатоўцы шчаціны. Прадстаўнікі арганізацый і брыгадзіры павінны падрыхтаваць кароткія інфармацыі па пытаньні загатоўкі шчаціны і конволасу. Таксама запрашаюцца прадстаўнікі цэнтральных газэт («Зьвязда», «Рабочай», «Агітабр», «Сельгаспрабочы Беларусі», «Чырв. зьмена», «Савецкая Беларусь»). На нараду просьба зьявіцца абавязкова і без спазьненьня ў вызначаны тэрмін.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і галоўная контора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-90	Начны рэдактар	6-12
Сакратар	10-71	Галоўная контора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел падпіскі	7-31
		Сэктар абнесган	7-31

Умовы падпіскі
ф дармовым дадаткам „Пра друк")

На 1 мес.	— 1 р
„ 3 мес.	— 3 „
„ 6 мес.	— 6 „
„ 12 мес.	— 12 „

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., і на гарадзкія абвесткі—40 к. за радок. Пасьля тэксту—у два разы дарожэй. Кантрамэнтны рахунак выдавецтва № 52|00001 у Дзяржбанку

Абвесткі прымаюцца ў контору выдавецтва „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая 63, 2-гі паверх тэл. 7-11.

Здавайце падпіску на газэту „Зьвязда" і на ўсе выданьні толькі на пошце

Згубленыя і ўкрадзеныя дакумэнты

пічыць несапраўднымі

Каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Корзуна С. Г., 4017; вык. ліст. Мен. суд. Жіроўскага М. І., 4018; бірж. тал., пашп., дав. аб пр. гол. Мен. мілі. Рубенчык Ж. Е., 4019-4022; мэтр. вып. Смал. ЗАГС Рубенчык Г. Е., 4021; пасьв. Мен. Сабезу Зьверавай П., 4023; чл. біл. с. швайн. Бамара М. Х., 4024; пасьв. аб сканч. праф. шк. мэт. Круглікава Т. П., 4025; мэтр. вып. Чэрв. мілі., дав. аб выб. пр. Вайн. с.-с. Врублеўскага Я. П., 4026-4027; пашп. Мен. мілі., вайск. біл. Мен. ваенк. Батвініка Е. А., 4028-4029; пенс. кн. № 193 Мен. Сабезу Палякова Д. А., 4030; віза № 3281 ДПУ Дзяменцея В. П., 4031; пасьв. № 61923 дзяржвыд. РСФСР Кудзельскага В. П., 4032; канд. карт. № 39278 Смал. РК Заромбы М. М., 4033; мэтр. вып. Мен. ЗАГС Клімовіча С. Я., 4034; дак. кн. страхк. МСПС Лясьніка Х. І., 4035; парт. біл., ас. карт. Бергера Х. Е., 4036-4037; дав. аб працы пагр. атр., квіт. на атр. дроў Гомаля Д. В., 4038-4039; пасьв. ас. Януш. с.-с. Ралкевіч М. В., 4040; вайск. біл. № 5308 Ніж. Гар. ваенк. Нарковіча Б. С., 4041; чл. біл. № 15505 с. СГС Мельцер У. В., 4042; вайск. кн. № 121/121 Слуцк. ваенк. Сьмірнова П. Я., 4043; пашп. Мен. мілі. Бабровай Н. Я., 4044; пасьв. ас. № 32076 Лутмана Р. Л., 4045; дав. аб пр. гол. Мен. мілі. Леўчука Н. П., 4046; чл. біл. № 1990 с. харч. Цяплова Я. Я., 4047; чл. біл. с. чыгунач., ас. пасьв. к-ры МБВ ч. Кавалькі А. П., 4048-4049; каап. кн. т-ва «Зямляроб» Цахановіча С. Б., 4116; каап. кн. т-ва «Зямляроб» Асядоўскага Ў. С., 4117; пасьв. Пярэсл. амбул. Ананіч Е. Я., 4118; вайск. кн. Ярц. ваенк. Пятрова А. С., 4119; пашп. Засл. РВК Турноўскай Н. М., 4120; вайск. кн. Мен. ваенк. Асінскага П. М., 4121; пасьв. 2 шк. Білейчык А. М., 4122; чл. біл. с. дрэваапрац. № 2900 Бушмакіна Б. Я., 4123; вайск. біл., пашп. Старынк. с.-с. Сідаровіча Я. Я., 3814-3815.

Пасьв. № 285 Рагачоўск. с.-с., віза Сьліж П. Я., 1182; чл. біл. № 43022 с. СГЛР Рубенчыка С. Я., 1183; пашп. кн. № 172 Калінк. спаж. т-ва Гукава Л., 1184; чл. кн. № 15757 с. РЗЛ, квіт. № 4043-4044 к-ры спраўд. Палякова Ф. Е., 1185; чл. кн. № 42100 с. РЗЛ Давідовіча А. Г., 1186; вайск. кн. № 1391 Хруцкага Я., 1187; 2 дав. аб сан. стан. Галенкевіча В. Д., 1188; вайск. кн. № 33/185 Лен. ваенк. Грыдзюшкі А. С., 1189; уклад. кн. Мухаед. с.-г. т-ва Міщанкі М., 1190; ас. пасьв. № 111/3 з-д р. аховы МБВ ч. Шарапава Р. Е., 1191; вайск. кн. Лепель РВК Гарбачова А. Ф., 1192; камс. біл. № 12287 Мартынава А., 1193; каап. кн. Барыс. ЦРК Пракопчыка С., 1194; пашп. Мен. мілі. Рагацэвіч Р. А., мэтр. вып. Мен. ЗАГС Рагацэвіч Г. В., 1195; вайск. кн. Мен. ваенк. Капца Я., 1196; кон. карт., вайск. кн. Пракоп'ева Т. Е., 1197-1198; вайск. біл. Чавуск. РВК Ёўдакімава К. А., 1199.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
СЭКТАР
КНІГАРАСПАУСЮДЖВАНЬНЯ

ГЭТЫМІ ДНЯМІ
ВЫХОДЗІЦЬ З ДРУКУ

В. ШАРАНГОВІЧ, С. МІЦЬКОЎ І А. КУРЫК
...ТЭМПЫ ВЫРАШАЮЦЬ!..
(Стэнаграмы дакладаў на Ўсебеларускай нарадзе рэдактароў газэт па пытаньні: „КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ, ПАСЕЎНАЯ КАМПАНІЯ І ДРУК".
З ПРАДМОВАЙ А. ЧАРНУШЭВІЧА

ПРАДАЕЦЦА
ва ўсіх кнігарнях
Белдзяржвыдавецтва
і спажыўкаапэрацыі

КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Сьвіні гумавы фільм справа 13 дзён „ПРАМІНАРТЫ" Звыш праграмы ХРОНІКА САЮЗКІНО № 1 за 1931 г. Каса—з 5 г.—Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 30 м.

Кіно-тэатр „Культура" — Новы фільм вытворчасьці Саюзкіно (Трэстбелдзяржкіно) Справаднае жыцьцё. Пач. сэансаў: у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 гад. 20 мін. Каса—5 гадзін

КІНО „Інтэрнацыянал" — Мастацкі фільм нямец. вытворчасьці ГОРНАЯ БАЛЯДА Пач. 1 сэансу ў 6 г.—Каса—з 4 г. 30 хв.

КІНО „Галэтары" — Мастацкі фільм паводле раману ШОЛЮМ-АЛЕЙХЕМА МАБУД (Крывавы пэтэн) дзіва ў 9 частках. Пач. 6 г., 7 г. 30 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 4 гадз.

Кіно „Юны Піянэр" — Эпізод з грамадзянскай вайны паводле аповесьці Д. Фурманава МЯЦЕЖ у 6 частках. Пач. сэансаў з 1 г. дня. Каса з 12 г.

КІНО „СПАРТАК" — ПАР ІЦЫЛІНСКІ ў фільме Закройшчык з Таржка камэдыя ў 6 частках. Пач. 6 г. 30 м.,